Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусі

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

***Т.В. Грышкевіч, Т.У. Янкоўская***

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

*Кантрольныя работы*

*для слухачоў*
*вочна-завочных падрыхтоўчых курсаў*

Мінск 2009

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 9(476)(075в)
ББК 63.3(4Беи)я75
Г917

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

*Рэцэнзент:*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт, намеснік дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі па навуковай рабоце *В.В. Даніловіч*

**Грышкевіч, Т.В.**
Г917 Гісторыя Беларусі : кантрольныя работы для слухачоў завочных падрыхтоўчых курсаў / Т.В. Грышкевіч, Т.У. Янкоўская. – Мінск : БДПУ, 2009. – 56 с.

У дапаможніку змешчаны кантрольныя работы па гісторыі Беларусі, прапанаваны метадычныя рэкамендацыі па іх выкананні.

Адрасуецца слухачам падрыхтоўчых курсаў БДПУ. Можа быць выкарыстаны ўсімі, хто рыхтуецца да тэсціравання па гісторыі Беларусі.

**УДК 9(476)(075в)**
**ББК 63.3(4Беи)я75**

© Грышкевіч Т.В., Янкоўская Т.У., 2009
© БДПУ, 2009

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тлумачальная запіска

Кантрольныя работы па гісторыі Беларусі прызначаны для слухачоў вочна-завочных падрыхтоўчых курсаў. Іх тэматыка і прапануемыя заданні адпавядаюць праграме ўступных іспытаў па гісторыі Беларусі, складзеных на аснове адукацыйнага стандарту агульнай сярэдняй адукацыі.

Кантрольная работа з'яўляецца часткай самастойнага вучэбнага працэсу слухачоў курсаў і адной з форм кантролю ведаў. Падрыхтоўка па пэўнай тэме адначасова з'яўляецца падрыхтоўкай да ўступных іспытаў. Яна павінна ўключаць адпрацоўку ўсяго комплексу ведаў і ўменняў – ад храналагічных да ацэначных, ад апісання да аналітычных уменняў.

Кантрольныя работы ўтрымліваюць заданні розных узроўняў складанасці. Яны прадугледжваюць закрытую форму пытання, якое можа мець некалькі правільных варыянтаў адказу (частка А), больш складаныя заданні, у якіх неабходна суаднесці паміж сабой элементы двух мностваў ці ў храналагічнай паслядоўнасці расставіць гістарычныя падзеі (частка В). Таксама кантрольныя работы ўтрымліваюць заданні з адкрытым адказам, калі слухачу неабходна самастойна дапісаць паняцце, прозвішча і г. д. (частка С).

У кожнай кантрольнай рабоце ёсць пісьмовае заданне, што прадугледжвае разгорнуты адказ (не менш за тры лісты). Яно накіравана на праверку гістарычных ведаў слухачоў, іх умення аналізаваць, сістэматызаваць і лагічна выкладаць гістарычную інфармацыю.

За ўвесь перыяд навучання слухачам падрыхтоўчых курсаў неабходна выканаць шэсць кантрольных работ. Тэматыку пяці работ слухач выбірае самастойна з першых васьмі тэм. Шостая кантрольная работа – гэта выніковая, якая ўтрымлівае заданні за ўвесь курс. У дапаможніку яна змешчана пад нумарам дзевяць і з'яўляецца абавязковай для выканання.

## Метадычныя рэкамендацыі

Пры падрыхтоўцы да кожнай тэмы слухачу неабходна пазнаёміцца з патрабаваннямі Праграмы ўступных іспытаў па гісторыі Беларусі, складзенай на аснове адукацыйнага стандарту агульнай сярэдняй адукацыі. Далей, скарыстаўшы матэрыял школьных падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, а таксама дадатковай літаратуры, вывучыць тэму. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца асноўным паняццям, тэрмінам, фактам і з'явам, асноўным тэндэнцыям, праблемам і асаблівасцям гістарычнага развіцця Беларусі. Слухач павінен добра ўяўляць, што ў працэсе падрыхтоўкі да тэсціравання важна не столькі ведаць змест усяго вышэйпералічанага, колькі ўмець прымяняць веды, сістэматызаваць факты на аснове паняццяў, устанаўліваць храналагічныя, прычынна-выніковыя і структурна-лагічныя сувязі.

Усе заданні неабходна выконваць у адпаведнасці з прапанаванымі ўмовамі і ў той паслядоўнасці, якая прапаноўваецца слухачу ў кантрольнай рабоце. Адказы на заданні ў "частцы А" павінны выглядаць наступным чынам: А1. 1 (калі адзін правільны варыянт адказу), А2. 1,3 (калі правільных адказаў два і больш) і г. д. Адказы на заданні ў "частцы В" таксама маюць сваю спецыфіку: В1. 1-2-3-4-5 (лагічная паслядоўнасць), В6. 1А, 2Б, 3В, 4Г

(суадносіны элементаў двух мностваў). Неабходна мець на ўвазе, што заданні на суадносіны могуць утрымліваць лішні варыянт, які ні з чым не стасуецца.

Амаль кожная кантрольная работа ўтрымлівае картаграфічнае заданне. Слухачу не толькі трэба правільна адказаць на пытанне, але і знайсці неабходны горад на карце-схеме.

Асноўным патрабаваннем да адказаў на заданні ў "частцы С" з'яўляецца дакладнае напісанне паняццяў, прозвішчаў і г. д. Адказ, які напісаны з граматычнай памылкай, не можа быць ацэнены станоўча і таму не залічваецца.

Адказ на пісьмовае заданне павінен быць самастойным, напісаным ясна і лаканічна, утрымліваць увесь неабходны матэрыял.

У канцы зробленай кантрольнай работы слухач павінен абавязкова даваць спіс выкарыстанай літаратуры (у алфавітным парадку).

Кожная кантрольная работа выконваецца ў асобным школьным сшытку і высылаецца ў тэрмін, вызначаны вучэбным планам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Кантрольная работа № 1

### Тэма: «Старажытнае грамадства. Беларускія землі ў раннім сярэдневякоўі»

### Частка А

**А1. Адна з самых вывучаных стаянак першабытнага чалавека, якая знаходзіцца ў Чачэрскім раёне датуецца:**

1) 100–35 тыс. да н. э.;
2) 35 тыс. да н. э.;
3) 24 тыс. да н. э.;
4) 21 тыс. да н. э.

**А2. Вызначце, што было характэрным для ранняродавай абшчыны:**

1) вядзенне прысвойваючай гаспадаркі;
2) вядзенне вытворчай гаспадаркі;
3) сувязь усіх членаў роду засноўвалася на паходжанні ад адной маці;
4) пераход ад парнай да манагамнай сям'і;
5) існаванне прыроднага (архаічнага) падзелу працы.

**А3. У канцы каменнага веку на паўночныя беларускія землі прыйшлі плямёны, для якіх быў характэрны посуд, пакрыты "ямачна-грабеньчатым" арнаментам. Магчымая этнічная прыналежнасць гэтых плямён:**

1) вызначыць нельга;
2) балты;
3) раннія славянскія плямёны;
4) фіна-угорскія плямёны.

**А4. У Цэнтральнай і Паўночнай Беларусі, на ўсходзе Літвы жылі плямёны, якія карысталіся гліняным посудам, пакрытым штрыхамі. Вызначце іх этнічную прыналежнасць:**

1) іх этнічная прыналежнасць не вызначана;
2) славяне;
3) фіна-угоры;
4) балты.

**А5. Выберыце, даныя якой (-іх) навукі даюць сучаснаму чалавеку веды аб тым, хто насяляў Беларусь у глыбокай старажытнасці:**

1) гідранімікі;
2) тапанімікі;
3) эпіграфікі;
4) сфрагістыкі.

**А6. Што з пералічанага было характэрным для культуры балтаў:**

1) паўзямлянкі;
2) ляпны слоікападобны посуд;
3) шыйныя грыўны;
4) скроневыя кольцы;
5) бранзалеты.

**А7. Пераход да суседскай абшчыны ва ўсходніх славян быў выкліканы:**

1) развіццём міжплемяннога абмену;
2) распаўсюджваннем гарадзішчаў;
3) распаўсюджваннем ворыўнага земляробства;
4) фарміраваннем родаплемянной знаці

**А8. Узнікненне і існаванне такіх форм элементаў арнаменту, як кола, крыжападобныя фігуры, зорка звязаны з:**

1) з'яўленнем плямён усходніх славян;
2) жывёлагадоўчымі і земляробчымі культамі;
3) паляваннем і збіральніцтвам;
4) распаўсюджваннем экзагаміі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А9. Найбольш старажытным прыкладам мастацтва, знойдзеным на тэрыторыі Беларусі, з'яўляецца:**
1) пласцінка з біўня маманта з нанесеным паверх арнаментам (чурынга);
2) жаночая статуэтка з біўня маманта;
3) малюнкі мамантаў на сцяне пячор;
4) скульптурныя выявы жывёл і птушак.
**А10. Бронзавая жаночая падвеска, у сярэдзіну якой залівалася шклопадобная маса чырвонага колеру, была характэрнай для:**
1) зарубінецкай культуры;
2) культуры шнуравой керамікі;
3) днепра-дзвінскай культуры;
4) кіеўскай культуры.
**А11. Старажытныя людзі насілі ўпрыгожванні на шыі, запясці, нашывалі на вопратку. Гэта праяўленне:**
1) татэмізму;
2) анімізму;
3) фетышызму;
4) наогул не звязана з першымі рэлігійнымі вераваннямі.
**А12. Сінтэзны шлях фарміравання феадальных адносін узнік:**
1) у выніку развіцця родаплемянных адносін;
2) на аснове сінтэзу славянскіх родаплемянных адносін і рымскіх рабаўладальніцкіх адносін;
3) на аснове сінтэзу германскіх родаплемянных адносін і рымскіх рабаўладальніцкіх адносін;
4) на аснове эвалюцыі бяссінтэзнага шляху.
**А13. Выберыце тое, што было характэрным для ўзнікнення і развіцця феадалізму ва ўсходніх славян:**
1) фарміраванне феадальных адносін па сінтэзным шляху;
2) фарміраванне феадальных адносін праходзіла па бяссінтэзным шляху;
3) марудная феадалізацыя грамадства;
4) іерархічная структура зямельнай уласнасці і сацыяльных адносін не склалася ў развітой форме;
5) іерархічная структура зямельнай уласнасці і сацыяльных адносін склалася ў развітой форме.
**А14. Выберыце тыя катэгорыі залежных сялян, прававое становішча якіх было прыкладна роўным:**
1) чэлядзь;
2) смерды;
3) ізгоі;
4) халопы;
5) радовічы.
**А15. Рала – гэта:**
1) ворыўная прылада працы накшталт прымітыўнага плуга;
2) назва сельскай абшчыны ва ўсходніх славян;
3) асноўная вытворчая адзінка ва ўсходніх славян;
4) назва аднаго з натуральных падаткаў ва ўсходніх славян.
**А16. Вылучце асноўныя шляхі ўзнікнення прыватнай уласнасці на зямлю ва ўсходніх славян:**
1) дыферэнцыяцыя абшчыннікаў вяла да ўзнікнення сялянскай уласнасці і ўласнасці родаплемяннай знаці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) у выніку дамоўленасці паміж сялянамі і князем;
3) прамы захоп абшчынных зямель князямі;
4) знешнепалітычны ўплыў

**А17. Што з пералічанага можна аднесці да функцый князя:**
1) прызначэнне епіскапа;
2) ажыццяўленне суда і ўнутранага кіравання;
3) арганізацыя і ўзначальванне войска;
4) кантроль за дзейнасцю веча;
5) збор даніны з падуладнага насельніцтва.

**А18. Суаднясіце асобу полацкага князя Усяслава Брачыславіча з гістарычнымі падзеямі:**
1) аднавіў княжацкую дынастыю ў Полацку;
2) зняў званы з Наўгародскай Сафіі;
3) усталяваў кантроль над валокамі каля Віцебска і Усвят;
4) паўстанне кіяўлян у 1068 г.;
5) пры ім пабудаваны Полацкі Сафійскі Сабор.

**А19. Які з прапанаваных варыянтаў утрымлівае пералік гадоў, у якія палачане хадзілі паходам на Вялікі Ноўгарад:**
1) 1021, 1066;
2) 1066, 1069;
3) 980, 1021;
4) 980, 1067.

**А20. Адзначце тое, што можа стаць аб'ектам даследавання эпіграфікі:**
1) віслыя пячаткі;
2) берасцяныя граматы;
3) "Аповесць мінулых часоў";
4) Рагвалодавы камяні;
5) кніжныя мініяцюры.

**А21. Выберыце, што характэрна для культурнага жыцця старажытнага Полацка:**
1) там знаходзілася самая старажытная мураваная пабудова ў Беларусі;
2) там знаходзілася бібліятэка з сярэдзіны XI ст.;
3) там упершыню ва Усходняй Еўропе з'явіўся помнік архітэктуры, упрыгожаны какошнікамі;
4) там у XII ст. быў створаны помнік пісьменства "Сказанне аб мніху Марціне".

**А22. Што з пералічанага можна лічыць нацыянальным сімвалам і рэліквіяй Беларусі:**
1) Полацкі Сафійскі сабор;
2) Барысаглебскую царкву;
3) крыж Л. Богшы;
4) творы Кірылы Тураўскага.

**А23. Знайдзіце на карце горад, дзе ўпершыню ва Усходняй Еўропе з'явіўся такі элемент архітэктуры, як какошнікі стрэльчатай формы:**
1) 1; 2) 2; 3) 3; 4) 4.



**А24. Плінфа – гэта:**
1) керамічны збан, умураваны ў сцяну;
2) назва царкоўнага музычнага інструмента;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) узор са смальты і каляровых каменьчыкаў;
4) шырокая і абпаленая цэгла;
5) частка праваслаўнага храма, якая нагадвае арку.

**А25. Язычніцкі бог Сонца ва ўсходніх славян:**
1) Пярун;
2) Дажбог;
3) Сварог;
4) Стрыбог;
5) Хорс.

**А26. Самая ранняя рукапісная кніга, знойдзеная на тэрыторыі Беларусі:**
1) "Лаўрышаўскае евангелле";
2) "Аповесць мінулых гадоў";
3) "Слова аб паходзе Ігаравым";
4) "Тураўскае евангелле".

**А27. Выберыце з пералічанага сцвярджэнні, што з'яўляюцца правільнымі:**
1) існаванне верві ў старажытнарускую эпоху з'яўляецца перажыткам родаплемяннога ладу;
2) збор князем даніны з падуладнага насельніцтва ў старажытнай Русі сведчыць пра завяршэнне працэсу запрыгоньвання сялян;
3) асноўная вытворчая адзінка ва ўсходніх славян ў старажытнарускую эпоху называлася "дым" ці "валока";
4) "дзядзінец" – гэта ўмацаваны цэнтр горада ва ўсходніх славян.

**А28. Выберыце з пералічанага сцвярджэнні, што з'яўляюцца правільнымі:**
1) такі від жаночага адзення, як спадніца, верагодней за ўсё з'явіўся і стаў распаўсюджвацца ў неаліце;
2) сацыяльная і маёмасная няроўнасць пачынае складацца сярод насельніцтва Беларусі ў каменным веку;
3) трывалае аб'яднанне некалькіх родаў называецца вялікай патрыярхальнай сям'ёй;
4) вера ў здольнасць чалавека асобным чынам уздзейнічаць на людзей, жывёл, раслін, іншыя з'явы прыроды называецца рэлігіяй.

**А29. Выберыце з пералічанага сцвярджэнні, што з'яўляюцца памылковымі:**
1) здабыча крэменю шахтным спосабам на тэрыторыі Беларусі пачалася ў пачатку бронзавага веку;
2) продкамі праслявян, прабалтаў, прагерманцаў былі індаеўрапейцы;
3) зліццё адной якой-небудзь народнасці, нацыі ці этнічнай групы з іншай народнасцю, нацыяй ці этнічнай групай і страта адной з іх сваёй мовы, культуры называецца асіміляцыяй;
4) апошняя эпоха каменнага веку завецца мезаліт.

**А30. Выберыце з пералічанага сцвярджэнні, што з'яўляюцца памылковымі:**
1) "Слова пра паход Ігаравы" ўтрымлівае заклік да яднання рускіх князёў, да аднаўлення магутнасці Кіеўскай Русі;
2) для сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх зямель у IX–XI стст. характэрна адсутнасць буйных міжнародных гандлёвых шляхоў;
3) для ўсходніх славян у VII–VIII стст. было характэрным будаваць паўзямлянкі;
4) да катэгорыі залежных людзей ва ўсходніх славян адносіліся радовічы, закупы, ізгоі, халопы, грыдні.

## Частка В

**В1. Вызначце ў паслядоўнасці час існавання розных археалагічных культур на тэрыторыі Беларусі:**
1) днепра-данецкая;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) пражская;
3) культура штрыхавой керамікі;
4) культура шнуравой керамікі;
5) заходнепалеская.

**В2. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**
1) з'яўленне керамікі;
2) пачатак выкарыстоўвання чалавекам лука і стрэл;
3) з'яўленне рала;
4) працэс аб'яднання родаў у плямёны;
5) пераход да вытворчай гаспадаркі.

**В3. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**
1) княжанне Усяслава Брачыславіча ў Кіеве;
2) утварэнне Полацкай епархіі;
3) княжанне Рагвалода;
4) першы летапісны ўспамін аб Тураве;
5) з'яўленне першага мураванага будынка на тэрыторыі Беларусі.

**В4. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**
1) бітва на р. Альце;
2) бітва на р. Нямізе;
3) бітва на р. Судамір;
4) бітва на р. Гзень.

**В5. Суаднясіце паміж сабой:**

| | |
|---|---|
| 1) перыяд, калі асноўнымі крыніцамі існавання чалавека былі збіральніцтва і паляванне на буйных жывёл; | А) палеаліт |
| 2) эпоха, калі патрыярхат прыйшоў на змену матрыярхату, а парная сям'я пачала ператварацца ў манагамную; | Б) мезаліт |
| 3) археалагічны перыяд, калі чалавек авалодаў тэхнікай пляцення і ткацтва; | В) неаліт |
| 4) з'яўленне ворыўнага земляробства. | Г) бронзавы век |
| | Д) жалезны век. |

**В6. Суаднясіце паміж сабой:**

| | |
|---|---|
| 1) пачатак здабычы крэменю шахтным спосабам; | А) 35–9 тыс. да н. э.; |
| 2) з'яўленне колавага транспарту; | Б) 9–5 тыс. да н. э.; |
| 3) вынаходніцтва лодкі; | В) 5–3 тыс. да н. э.; |
| 4) узнікненне ранняродавай абшчыны ў Беларусі. | Г) 2 тыс. да н. э. – 7 ст. да н. э.; |
| | Д) 7ст. да н.э. – 5 ст. н.э. |

**В7. Суаднясіце паміж сабой даныя левага слупка і назву вёскі ў правым:**

| | |
|---|---|
| 1) знаходка самага старажытнага ў Беларусі драўлянага рала; | А) Капланавічы |
| 2) бронзавыя жаночыя падвескі "лунніцы"; | Б) Лабеншчына |
| 3) шкляныя антычныя пацеркі і гліняныя амфары; | В) Адаменка |
| 4) гладкасценная кераміка з плоскім дном і падоўжанай прапорцыяй. | Г) Пруднікі |
| | Д) Чаплін. |



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**В8. Суаднясіце паміж сабой азначэнне і паняцце:**

| | |
|---|---|
| 1) месца збору даніны ва ўсходніх славян; | А) гарадзішча |
| 2) асноўны тып паселішча ў жалезным веку; | Б) пагост |
| 3) назва сельскай абшчыны ў славян; | В) верв |
| 4) месца, дзе славяне-язычнікі ўшаноўвалі багоў і прыносілі ім ахвяры. | Г) селішча |
| | Д) капішча. |

**В9. Суаднясіце гістарычную асобу і падзею, у якой яна прымала ўдзел:**

| | |
|---|---|
| 1) Святаполк Акаянны; | А) бітва на р. Гзень; |
| 2) Святаполк Ізяславіч; | Б) бітва на р. Стрэве; |
| 3) Усяслаў Брачыславіч; | В) бітва на р. Альце; |
| 4) Брачыслаў Ізяславіч. | Г) Любецкі з'езд. |

**В10. Суаднясіце паміж сабой:**

| | |
|---|---|
| 1) Кіеў; | А) помнік абарончага дойлідства XIII ст.; |
| 2) Полацк; | Б) берасцяная грамата, у якой гаворыцца аб куплі пшаніцы на 4,5 грыўні; |
| 3) Камянец; | В) Дзесяцінная царква; |
| 4) Віцебск; | Г) берасцяная грамата, у якой гаворыцца аб куплі жыта на 6 грыўняў; |
| 5) Мсціслаўль. | Д) Ляшчанскі манастыр. |

## Частка С

**Дайце азначэнне наступным паняццям:**

**С1.** Калектыў (невялікая група) старажытных людзей, якія вялі агульную гаспадарку і сумесна валодалі прыладамі працы – гэта...

**С2.** Абшчына, для якой характэрна, з аднаго боку, калектыўная валоданне зямлёй, пашамі, вадаёмамі. А з другога – прыватнае сямейнае землекарыстанне, прыватная ўласнасць на прылады працы і на вынікі працы сям'і, называлася...

**С3.** Такі парадак жыцця старажытных людзей, калі яны супольна працуюць, маюць агульную маёмасць і аб'ядноўваюцца ў статак ці род, называецца...

**С4.** Агульныя продкі старажытных славян – гэта ...

**С5.** Вера ў агульнае паходжанне, звышнатуральныя сувязі паміж групай людзей – родзічаў (род) і пэўным відам жывёл, раслін, прадметам ці з'явай – гэта ...

**С6.** Сукупнасць няпісаных правіл паводзін (звычаяў), якія папярэднічалі з'яўленню законаў – гэта...

**С7.** Усе вернікі, якія ажыццяўляюць набажэнства ў адной царкве (прыходзе) называюцца...

**С8.** Сяляне, якія не карысталіся падтрымкай сваёй абшчыны, халопы, якія былі вольнаадпушчанымі або выкупіліся і іншыя асобы, што выйшлі са свайго асяроддзя, называліся...

**С9.** Намеснік князя, які па загадзе свайго гаспадара і ад яго імя кіраваў пэўнай тэрыторыяй, ва ўсходніх славян называўся...

**С10.** Плата залежных сялян феадалу прадуктамі сваёй гаспадаркі за карыстанне зямлёй – ...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Пісьмовае заданне**

Напішыце адказ на пытанне "*Засяленне тэрыторыі Беларусі*" і запоўніце табліцу "Старажытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі"

| Перыяд | Храналагічныя межы | Прыродна-кліматычныя змены | Здабыткі ў матэрыяльнай і духоўнай культуры | Змены ў сацыяльнай арганізацыі | Археалагічныя культуры[1] (месцазнаходжанне, характэрныя рысы) |
|---|---|---|---|---|---|
| Каменны век | | | | | |
| палеаліт | | | | | |
| мезаліт | | | | | |
| неаліт | | | | | |
| Бронзавы век | | | | | |
| бронзавы век | | | | | |
| Жалезны век | | | | | |
| ранні жалезны век | | | | | |
| перыяд рымскіх уплываў | | | | | |

## Кантрольная работа № 2

### Тэма: «Беларускія землі ў другой палове XII – сярэдзіне XVI стагоддзя»

### Частка А

**А1. Выберыце тое, што, на вашу думку, правільна дапаўняе выказванне "феадальная раздробленасць":**
1) на беларускіх землях не назіралася;
2) характарызавалася бесперапыннай міжусобнай барацьбой;
3) станоўча адбілася на развіцці беларускіх зямель;
4) гэта заканамерная з'ява падчас эвалюцыі феадальных адносін.

**А2. Юрыдычнае замацаванне раздробленасці старажытнарускай дзяржавы (Кіеўскай Русі) адбылося ў:**
1) 1067 г.; 2) 1097 г.; 3) 1101 г.; 4) 1084 г.

**А3. Які з пералічаных удзелаў не належаў Полацкай зямлі ў XI – XIII ст.:**
1) Віцебскі; 3) Друцкі; 5) Лагойскі;
2) Менскі; 4) Слуцкі; 6) Ізяслаўльскі.

**А4. Якая з названых падзей адбылася раней:**
1) з'яўленне тэўтонскага ордэна ва Усходняй Прыбалтыцы;
2) заснаванне Рыгі;

[1] Слупок запаўняецца данымі, што ўтрымліваюцца ў школьных падручніках (глядзіце спіс літаратуры).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) пачатак княжання ў Полацку Уладзіміра (Валодшы);
4) пачатак феадальнай раздробленасці Тураўскай зямлі

**А5. Працэс утварэння ВКЛ пачаўся ў:**
1) пачатку XIII ст.;
2) сярэдзіне XIII ст.;
3) канцы XIII ст.;
4) другой палове XIV ст.

**А6. Існуюць меркаванні аб тым, што летапісная Літва знаходзілася:**
1) на тэрыторыі сучаснай Літвы;
2) на тэрыторыі Літвы і часткі Латвіі;
3) на беларуска-літоўскім памежжы;
4) на тэрыторыі Беларусі паміж Навагрудкам і Мінскам.

**А7. Выберыце шляхі далучэння беларускіх зямель да ВКЛ:**
1) ваенна-палітычны ўціск;
2) дагавор;
3) прывілеі вялікіх князёў;
4) дынастычны шлюб.

**А8. Як федэратыўная дзяржава ВКЛ складалася з:**
1) асобных княстваў;
2) "Літвы" і "Русі";
3) "Літвы", "Чорнай Русі" і "Белай Русі";
4) магнацкіх латыфундый.

**А9. У час княжання Віценя да ВКЛ былі далучаны:**
1) Полацкая зямля;
2) Віцебская зямля;
3) Берасцейская зямля;
4) Мінская зямля.

**А10. Знайдзіце на карце горад, які стаў цэнтрам асобнай літоўскай мітраполіі, што з'явілася пры Альгердзе:**
1) 1; 2) 2; 3) 3; 4) 4.



**А11. Што з пералічанага можна аднесці да станоўчых вынікаў заключэння Крэўскай уніі:**
1) узмацненне абараназдольнасці двух дзяржаў;
2) раскол беларускага этнасу па рэлігійнай прыкмеце;
3) рост культурных сувязяў паміж ВКЛ і краінамі Заходняй Еўропы;
4) рост культурных, эканамічных і іншых сувязей паміж ВКЛ і Польшчай.

**А12. Заканадаўчыя дакументы ВКЛ, якія ўраўноўвалі правы праваслаўных феадалаў з каталікамі:**
1) прывілей 1413 г.;
2) прывілей 1434 г.;
3) прывілей 1447 г.;
4) «Устава на валокі»;
5) прывілей 1563 г.

**А13. Ці правільна, што ў 1529 годзе:** а) быў зацверджаны І Статут ВКЛ? б) вялікім князем быў абвешчаны Жыгімонт ІІ Аўгуст? в) узнік тэрмін "пратэстантызм"?
1) правільна а);
2) правільна б);
3) правільна в);
4) правільныя ўсе варыянты;
5) усе варыянты памылковыя.

**А14. Віленскія біскуп, ваявода і кашталян, трокскія ваявода і кашталян утваралі:**
1) вялікакняжацкую раду;
2) соймік;
3) вальны сойм;
4) праднейшую раду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А15. Выберыце гістарычнае паняцце, якое сведчыць аб фарміраванні ў ВКЛ саслоўна-прадстаўнічай манархіі:**
1) гаспадар; 3) ваявода;
2) паны-рада; 4) магістрат.
**А16. Баяры ў ВКЛ XIV – XV стст. – гэта:**
1) прадстаўнікі старэйшай дружыны князя;
2) служылыя людзі, якія атрымлівалі зямлю за нясенне ваеннай службы;
3) тытулаваная знаць;
4) найбольш прывілеяваная частка феадальнага грамадства.
**А17. У Беларусі ў XVI стагоддзі:**
1) канчаткова склалася саслоўна-класавая структура беларускага грамадства;
2) пачалося фарміраванне беларускага этнасу;
3) у асноўным завяршылася фарміраванне беларускага этнасу;
4) сфарміравалася заходняя мяжа этнічнай тэрыторыі Беларусі.
**А18. Каморнікі ў ВКЛ – гэта:**
1) прадстаўнікі гарадской адміністрацыі;
2) найбяднейшае насельніцтва горада і вёскі;
3) ваенна-служылыя людзі;
4) сярэдняе купецтва.
**А19. Заканадаўчы акт, які ўвёў новы парадак землекарыстання і падаткаабкладання ў ВКЛ:**
1) прывілей 1447 г.; 3) "Устава на валокі" 1557 г.;
2) Статут ВКЛ 1588 г.; 4) Судзебнік 1468 г.
**А20. Фальваркавыя гаспадаркі ў ВКЛ найбольш былі распаўсюджаны ў:**
1) Падзвінні і Падняпроўі; 3) Падзвінні і Панямонні;
2) Падняпроўі і Панямонні; 4) Панямонні і Пабужжы.
**А21. У 1-й палове XVI ст. рамеснікі пачынаюць аб'ядноўвацца ў прафесійныя арганізацыі. У Гародні яны называліся:**
1) цэхі; 2) сотні; 3) староствы; 4) брацтвы.
**А22. Тыпы, характар жылля і гаспадарчых пабудоў у Беларусі ў XIV – XVI стст. вызначалі:**
1) прыродна-кліматычныя фактары;
2) сацыяльна-эканамічныя фактары;
3) традыцыі побытавага і духоўнага жыцця;
4) развіццё знешніх зносін.
**А23. Нясвіж, Мір, Геранёны, Смаляны аб'ядноўвае (-юць):**
1) заснаванне друкарняў;
2) будаўніцтва прыватнаўласніцкіх палацава-замкавых комплексаў;
3) гэта асноўныя цэнтры сялянскіх паўстанняў XVI ст.;
4) заснаванне езуіцкіх калегіумаў.
**А24. Ці правільна, што ў XIV – XV стст. у грамадскім жыцці, ідэалогіі і культуры ВКЛ больш моцным быў уплыў:** а) праваслаўя? б) каталіцызму?
1) правільна а); 3) у гэты час гэтыя канфесіі мелі роўны ўплыў;
2) правільна б); 4) абодва варыянты памылковыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А25. Адкажыце, у якім горадзе быў надрукаваны першы ва Усходняй Еўропе поўны звод Бібліі ў перакладзе на польскую мову:**

1) Прага;
2) Вільня;
3) Нясвіж;
4) Берасце;
5) Кракаў.

**А26. Якія сцвярджэнні з'яўляюцца памылковымі::**

1) у XV–XVI ст. асноўнымі ворагамі ВКЛ з'яўляліся Маскоўская дзяржава і Польшча;
2) ардыншчыну ВКЛ выплачвала Залатой Ардзе;
3) полацкія архіепіскапы ўваходзілі ў савет полацкага князя;
4) пачынаючы з XVI ст. назва "Русь" у дачыненні да Падзвіння і Падняпроўя пачынае выцясняцца назвай "Белая Русь".

**А27. Выберыце з пералічанага сцвярджэнні, што з'яўляюцца правільнымі:**

1) самастойныя тэрытарыяльныя адзінкі, на якія распадаецца дзяржава ў перыяд феадальнай раздробленасці, называюць удзельнымі княствамі;
2) удзел у Любецкім з'ездзе-снеме прымаў тураўскі князь Святаполк Акаянны;
3) прычынай паланення ў 1129 г. амаль усіх полацкіх князёў кіеўскім князем Мсціславам стала спроба полацкага князя Барыса захапіць Кіеўскі трон;
4) у барацьбе з крыжакамі асабліва вызначыўся князь Кукенойса Вячка.

**А28. Выберыце з пералічанага сцвярджэнні, што з'яўляюцца правільнымі:**

1) Жыгімонт II – апошні прадстаўнік Ягелонаў на польскім троне;
2) кагал – гэта цэнтральны орган яўрэйскага самакіравання;
3) крымчакі былі разбіты каля Клецка войскам М. Глінскага;
4) вайсковая адзінка ў ВКЛ, сцягі гэтай адзінкі называліся харуства;
5) К. Астрожскі – вядомы уніяцкі мітрапаліт.

**А29. Выберыце з пералічанага сцвярджэнні, што з'яўляюцца памылковымі:**

1) жэмайты, якіх узначаліў Давыд Гарадзенскі, у 1260 г. разбілі крыжакоў на воз. Дурбэ;
2) Давыд Гарадзенскі загінуў падчас паходу на Брандэнбург;
3) на беларускіх землях пэўны час існавала мангола-татарскае іга;
4) з пачаткам фарміравання ВКЛ пачынаецца працэс феадальнай раздробленасці беларускіх зямель.

**А30. Выберыце з пералічанага сцвярджэнні, што з'яўляюцца памылковымі:**

1) праваслаўныя вернікі Беларусі шанавалі трох віленскіх пакутнікаў: Антонія, Івана, Яўстафія;
2) "мітраполія Кіеўская і ўсяе Русі" – арганізацыя Праваслаўнай Царквы ў ВКЛ з другой паловы XV ст.;
3) Смаленск быў далучаны да ВКЛ пры Віцені;
4) канчаткова сяляне былі запрыгонены рэформай 1557 г.

## Частка В

**В1. Вызначце ў паслядоўнасці:**

1) створаны ордэн Мечаносцаў;
2) бітва на рацэ Сіці;
3) каранацыя Міндоўга ў Навагрудку;
4) аблога полацкім войскам нямецкіх крэпасцей Іксюль і Гольм;
5) перасяленне Тэўтонскага ордэна ў Прыбалтыку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**В2. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**
1) пачатак княжання ў ВКЛ Гедыміна;
2) далучэннне да ВКЛ Кіеўшчыны;
3) разгром мангола-татар адным з вялікіх князёў – адна з самых буйных бітваў сярэдневякоўя;
4) канчатковае ўключэнне ў склад ВКЛ Жамойціі;
5) заканчэнне дынастычнай барацьбы ў ВКЛ.

**В3. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**
1) грамадзянская вайна ў ВКЛ;
2) мяркуемая каранацыя Вітаўта;
3) выступленне супраць вярхоўнай улады ВКЛ М. Глінскага;
4) змова праваслаўных феадалаў ВКЛ на чале з М. Алелькавічам супраць Казіміра IV;
5) ВКЛ афіцыйна стала называцца "Вялікім княствам Літоўскім, Рускім і Жамойцкім".

**В4. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**
1) бітва пад Вількамірам;
2) бітва на р. Ведрашы;
3) бітва на р. Лань;
4) бітва ля в. Таненберг;
5) бітва на р. Крапіўні.

**В5. Суаднясіце паміж сабой:**
1) гродскі суд;
2) копны суд;
3) земскі суд;
4) падкаморскі суд.

А) шляхціц, баярын і селянін выступалі ў судзе раўнапраўнымі асобамі;
Б) вырашаў пераважна крымінальныя справы;
В) вырашаў пазямельныя спрэчкі феадалаў;
Г) вышэйшая судовая інстанцыя ВКЛ;
Д) разглядаў справы князёў, шляхты і баяр, што мелі свае землі ў павеце.

**В6. Суаднясіце паміж сабой:**
1) "Аповесць мінулых часоў";
2) "Хроніка Быхаўца";
3) Ліфляндская хроніка;
4) пісьмовыя крыніцы г. Кведлінбурга.

А) "пачаў княжыць [Міндоўг] адзін ва ўсёй зямлі Літоўскай...";
Б) паход Яраслава Мудрага супраць Літвы;
В) упершыню ўзгадваецца назва Літва;
Г) расказваецца аб пачатку ўзброенай барацьбы літоўскіх плямён з крыжакамі;
Д) Міндоўг быў названы "магутным каралём літоўскім".

**В7. Суаднясіце паміж сабой:**
1) Глеб;
2) Міндоўг;
3) Уладзімір;
4) Вячка.

А) "сапраўдны д'ябал";
Б) "кароль Літвы і Русі";
В) жадаў пашырыць свае землі за кошт Смаленскага і Тураўскага княстваў;
Г) "магутны кароль літоўскі".
Д) вёў барацьбу з крыжакамі.

**В8. Суаднясіце паміж сабой:**
1) Альгерд;
2) Гедымін;
3) Віцень.

А) "Пагоня";
Б) Кулікоўская бітва;
В) паходы на Маскву;
Г) Вільня.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**B9. Суаднясіце паміж сабой:**

1) Крэўская унія; А) Уладзіслаў II і Вітаўт;
2) Люблінская унія; Б) Ягайла і Ядвіга;
3) Віленска-Радамская унія; В) Свідрыгайла і Жыгімонт;
Г) Казімір IV
4) Грамадзянская вайна. Д) Жыгімонт II Аўгуст.

**B10. Суаднясіце паміж сабой:**

| | |
|---|---|
| 1) ваяводства; | А) некалькі воласцей (10–30 сельскіх пасяленняў); |
| 2) павет; | Б) зямельнае ўладанне, якое давалася за нясенне ваеннай ці адміністрацыйнай службы; |
| 3) вотчына; | В) адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, уведзеная Гарадзельскім прывілеем; |
| 4) парафія. | Г) зямельнае ўладанне, якое пераходзіла ў спадчыну; |
| | Д) самая дробная гаспадарча-адміністрацыйная адзінка ў царкве. |

## Частка С

**Дайце азначэнне наступным паняццям:**

**С1.** Грамадская група, якая мае пэўныя правы і абавязкі, атрыманыя па спадчыне…
**С2.** Назва сярэдневяковых манаскіх ці духоўна-рыцарскіх арганізацый каталіцкай і Уніяцкай цэркваў, якія мелі свае акрэсленыя мэты і статуты – гэта …
**С3.** Часткі гарадоў, якія падпарадкоўваліся феадалам і на жыхароў якіх не пашыралася судовая і адміністрацыйная ўлада магістрата, называліся …
**С4.** У XVI ст. аснову войска ВКЛ складала …
**С5.** Сход шляхты павета ці ваяводства ў ВКЛ...
**С6.** Аб'яднанне дзяржаў пад уладай аднаго манарха...
**С7.** Старшыня на пасяджэннях сойма ВКЛ…
**С8.** Дзяржаўны дакумент, у якім князь ці кароль даваў або пацвярджаў правы феадалаў ці гарадоў, называецца …
**С9.** Суконная даматканая спадніца з паласатай ці клетчатай тканіны называлася...
**С10.** Устойлівая супольнасць людзей, якая склалася гістарычна і характарызуецца асаблівасцямі мовы, побыту, культуры, рыс псіхікі і самасвядомасці, што перадаецца з пакалення ў пакаленне…

**Пісьмовае заданне**

Напішыце адказ на пытанне "*Унутрыпалітычнае і знешнепалітычнае развіццё ВКЛ у канцы XIII – другой палове XIV ст.*".

## Кантрольная работа № 3

### Тэма: «Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай (1569 г. – канец XVIII ст.)»

### Частка А

**А1. Рэч Паспалітая была створана ў выніку заключэння:**

1) Крэўскай уніі; 3) Гарадзельскай уніі;



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

2) Віленска-Радамскай уніі;
4) Люблінскай уніі.

**А2. Галоўнай прычынай дзяржаўнай уніі паміж ВКЛ і Польшчай стала:**
1) імкненне польскіх феадалаў захапіць багатыя суседнія землі;
2) катастрафічнае, на грані страты незалежнасці, становішча ВКЛ у час Лівонскай вайны;
3) імкненне вялікакняжацкай шляхты да польскіх "залатых шляхецкіх вольнасцяў";
4) магнаты ВКЛ хацелі пашырыць сваю ўладу.

**А3. Што з'яўляецца самым значным пацвярджэннем самастойнасці ВКЛ у складзе РП:**
1) свая дзяржаўная мова;
2) Галоўны трыбунал;
3) Статут 1588 г.;
4) тое, што працягвалі рэгулярна збірацца агульнадзяржаўныя соймы ВКЛ.

**А4. Паланізацыя шляхты ў ВКЛ адбывалася праз:**
1) рэлігію;
2) адміністрацыйную і ваенную службу;
3) мову;
4) падаткавую палітыку;
5) прывілеі.

**А5. Якая адзіная пасада гарадской улады ў ВКЛ не была выбарнай:**
1) войт;
2) лентвойт;
3) бурмістр;
4) лаўнік.

**А6. Рамеснік XVI–XVII стст. не мог прадаваць сваю прадукцыю на мясцовым рынку, калі:**
1) жыў у горадзе, які не меў магдэбургскага права;
2) не ўваходзіў у цэхавую арганізацыю;
3) не здаў экзамен на майстра;
4) абмежаванняў не існавала.

**А7. Юрыдычнае афармленне прыгону ў ВКЛ было завершана:**
1) прывілеем 1447 г.;
2) Судзебнікам 1468 г.;
3) аграрнай рэформай 1557 г.;
4) Статутам 1566 г.;
5) Статутам 1588 г.

**А8. Шырокі грамадска-палітычны рух, накіраваны супраць усеўладдзя Каталіцкай Царквы, атрымаў назву:**
1) рэфармацыя;
2) контррэфармацыя;
3) уніяцтва;
4) асветніцтва.

**А9. У XVI ст. супраць царкоўнага догмату аб трыадзінстве Бога выступалі:**
1) антытрынітарыі;
2) анабаптысты;
3) кальвіністы;
4) лютэране.

**А10. Рэфармацыйны рух у ВКЛ характарызаваўся тым, што:**
1) ахапіў толькі народныя нізы;
2) ахапіў увесь народ;
3) ахапіў толькі вышэйшыя колы грамадства;
4) ахапіў толькі прадстаўнікоў духавенства.

**А11. З'яўленне паняцця "пратэстантызм" звязана з:**
1) Адраджэннем;
3) Рэфармацыяй;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) Асветніцтвам; 4) Контрэфармацыяй.

**А12. Ці правільна, што дзейнасць полацкага уніяцкага архіепіскапа І. Кунцэвіча:** а) прыпадае на першы этап станаўлення ўніяцкай царквы і характарызуецца гвалтоўнымі метадамі? б) прыпадае на другі этап станаўлення уніяцкай царквы і носіць памяркоўны, кампрамісны характар?

1) правільна а); 3) гэта асоба ніякага дачынення да уніяцкай царквы не мае;
2) правільна б); 4) І. Кунцэвіч – вядомы вучоны-філосаф.

**А13. Пасля Берасцейскай уніі разгарнулася палеміка паміж рэлігійнымі і палітычнымі дзеячамі. Выберыце тых, хто прадстаўляў Праваслаўную Царкву:**

1) П. Скарга; 5) Я. Намыслоўскі;
2) Стэфан і Лаўрэнцій Зізаніі; 6) М. Сматрыцкі;
3) І. Пацей; 7) Л. Карповіч.
4) Л. Крэўза;

**А14. Антытрынітарыі падзяляліся на дзве плыні: радыкальную і больш памяркоўную. Найбольш вядомымі прадстаўнікамі памяркоўнага напрамку ў Беларусі былі:**

1) С. Будны; 3) М Радзівіл Чорны;
2) В. Цяпінскі; 4) Феадосій Касы.

**А15. Клiентэла – гэта:**

1) кліенты дробнага гандляра; 3) залежныя ад магната шляхціцы;
2) кліенты гарадскога рамесніка; 4) такога паняцця ў гісторыі няма.

**А16. Паняцце "паказачванне"азначае:**

1) уцёкі сялян у Запарожскую Сеч;
2) далучэнне сялян да казацкіх загонаў Б. Хмяльніцкага;
3) антыфеадальны рух у XVII ст.;
4) барацьбу сялян супраць прыгону.

**А17. У якім горадзе больш за 2 гады кіравала "рамесніцкая рада" і праводзіла палітыку ў інтарэсах гарадскіх нізоў:**

1) Мінску; 3) Магілёве;
2) Пінску; 4) Гомелі.

**А18. У вайну 1654–1667 гг. сяляне і мяшчане стваралі ўзброеныя атрады для самаабароны. Царскія афіцэры называлі іх:**

1) шышы; 3) партызаны;
2) касінеры; 4) здраднікі.

**А19. Якія гарады не былі заняты рускімі войскамі на першым этапе вайны 1654–1667 гг.:**

1) Слуцк; 5) Новы Быхаў;
2) Пінск; 6) Гродна;
3) Стары Быхаў; 7) Бабруйск.
4) Брэст;

**А20. Выберыце першыя мануфактуры, якія з'явіліся ў Беларусі ў 10–30-х гг. XVIII ст.:**

1) Слуцкая; 3) Урэцкая;
2) Налібоцкая; 4) Карэліцкая.

**А21. Першая на сучаснай тэрыторыі Беларусі друкарня дзейнічала ў:**

1) Нясвіжы; 3) Магілёве;
2) Бярэсці; 4) Вільні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А22. Касцёл езуітаў у Нясвіжы – першы ў Беларусі і ва ўсёй РП помнік архітэктуры стылю:**

1) готыка;
2) барока;
3) віленскага барока;
4) ракако.

**А23. Знайдзіце на карце горад, у якім нарадзіўсяС.Е.Пятроўскі-Сітніяновіч:**

1) 1; 2) 2; 3) 3; 4) 4.



**А24. Хто першым у Еўропе ўзяўся ў другой палове XVII ст. за пераклад і паралельнае выданне Евангелля на 2-х мовах (царкоўнаславянскай і беларускай):**

1) С. Будны;
2) Ф. Скарына;
3) В. Цяпінскі;
4) І. Фёдараў.

**А25. Назва першай газеты, якая выдавалася на беларускай зямлі:**

1) "Мінскія губернскія ведамасці";
2) "Мінскія епархіяльныя ведамасці";
3) "Газета Гродзенская";
4) "Мінскі лісток".

**А26. Якая з названых падзей адбылася раней:**

1) "Нямы" сойм;
2) бітва ля в. Лясная;
3) заключэнне Альтранштацкага міру;
4) бітва пад Палтавай.

**А27. Якія сцвярджэнні з'яўляюцца памылковымі:**

1) праваслаўныя царкоўныя арганізацыі, якія садзейнічалі шырокаму пратэсту супраць уніі, называліся брацтвамі;
2) Ям-Запольскі мір быў заключаны у 1582 г. Стэфанам Баторыем і Іванам IV;
3) згодна пастанове сойма 1673 г., кожнае трэцяе пасяджэнне гэтага органа ўлады павінна было адбывацца ў Навагрудку;
4) Бітва пад Лоевам – гэта бітва паміж войскамі Рэчы Паспалітай і Расіі.

**А28. Якія сцвярджэнні з'яўляюцца памылковымі:**

1) дзейнасць Джавані Бернардоні была звязана са старажытным беларускім горадам Нясвіжам;
2) на ўтрыманне войска памешчыцкія сяляне выплачвалі гіберна, а дзяржаўныя – рэйтаршчыну;
3) галота – гэта частка шляхецкага саслоўя;
4) заснаванне ў беларускіх землях манастыроў францысканцаў, аўгусцінцаў, бернардзінцаў, сведчыла аб узмацненні Контррэфармацыі.

**А29. Якія сцвярджэнні з'яўляюцца правільнымі:**

1) на Берасцейскі сабор з'ехаліся прадстаўнікі вышэйшага праваслаўнага і каталіцкага духавенства;
2) удзельнікі Берасцейскага сабору падзяляліся на дзве часткі, якія збіраліся і працавалі паасобку;
3) прыхільнікі уніяцтва на Берасцейскім саборы адлучылі ад хрысціянскай веры праваслаўнае духавенства;
4) усе ўдзельнікі Берасцейскага сабору зацвердзілі царкоўную унію.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

**А30. Якія сцвярджэнні з'яўляюцца правільнымі:**

1) Уладзіслаў IV Ваза быў абвешчаны рускім царом;
2) сяляне, для якіх асноўнай формай павіннаці была паншчына, у Рэчы Паспалітай называліся асаднымі;
3) лялечны тэатр у ВКЛ называўся батлейка;
4) Рэфармацыя была падтрымана ўсімі слаямі грамадства ВКЛ.

## Частка В

**В1. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

1) Ян III Сабескі;
2) Жыгімонт III Ваза;
3) Стэфан Баторый;
4) Станіслаў Ляшчынскі;
5) Станіслаў II Аўгуст;
6) Аўгуст III Фрыдрых.

**В2. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**

1) паўстанне Б. Хмяльніцкага;
2) рух пад кіраўніцтвам С. Налівайкі;
3) паўстанне на Каменшчыне;
4) паўстанне пад кіраўніцтвам В. Вашчылы.

**В3. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**

1) перавод усяго справаводства ў РП на польскую мову;
2) "ілжэдзмітрыяда";
3) далучэнне Левабярэжнай Украіны да Расіі;
4) заснаванне кальвінісцкай гімназіі ў Слуцку.

**В4. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**

1) Аліўскі мірны дагавор;
2) Віленскае перамір'е;
3) Кейданскі дагавор;
4) Пераяслаўская Рада.

**В5. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**

1) стварэнне Сандамірскай і Варшаўскай канфедэрацый;
2) завяршэнне другой Паўночнай вайны;
3) бітва паміж магнацкімі групоўкамі каля Алькенікаў;
4) заключэнне антышведскага дагавора паміж РП і Расіяй.

**В6. Суаднясіце паміж сабой:**

1) агульнае
2) асобнае.

А) сойм;
Б) органы ўлады (адміністрацыя);
В) заканадаўства і судовая сістэма;
Г) сенат;
Д) мова;
Е) войска;
Ж) тытул і пячатка.

**В7. Суаднясіце паміж сабой:**

1) мірны дагавор у Ям-Заполлі;
2) мірны дагавор у Андросаве;
3) мірны дагавор у Белай;
4) Дэўлінскае перамір'е.

А) Уладзіслаў IV за выкуп адмовіўся ад сваіх правоў на маскоўскі трон;
Б) Маскоўскае царства здолела замацавацца ў Прыбалтыцы, якая была

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

падзелена паміж РП і Швецыяй;
В) Смаленск і Северская зямля перайшлі да Расіі, а землі беларускага Падзвіння вярнуліся ў склад ВКЛ; замацоўваўся падзел Украіны на 2 часткі;
Г) Да Рэчы Паспалітай адышлі Смаленск і Чарнігава-Северскія землі.
Д) часовае спыненне вайны паміж РП і Расіяй.

**В8. Суаднясіце паміж сабой** (Узор адказу: 1Аа,2Бб,3Вв,4Гг):

| | | |
|---|---|---|
| 1) Л. Сапега | А) паэт | а) "...Не ўжываць "польские або иныя писма", а развіваць адукацыю на роднай мове"; |
| 2) Філон Кміта-Чарнабыльскі | Б) кнігавыдавец | б) "Не дай бог ляху быць каралём, выража Літву і тым больш Русь"; |
| 3)Я.К. Пашкевіч | В) канцлер | в) "Польска квітнет лаціною, Літва квітнет русчызною"; |
| 4) В. Цяпінскі. | Г) стараста. | г) "Не чужой якой моваю, але сваёю ўласнай правы пісаныя маем". |

**В9. Суаднясіце паміж сабой:**

| | | |
|---|---|---|
| 1) бой пад Галоўчынам; | А) 1709; | Г) 3.07.1708; |
| 2) "Маці Палтаўскай баталіі"; | Б) 1700; | Д) 28.09.1708. |
| 3) Палтаўская бітва; | В) 1654; | |
| 4) Пераяслаўская рада. | | |

**В10. Суаднясіце паміж сабой:**

| | |
|---|---|
| 1) Ж. Жылібер; | А) вывучаў планету Меркурый і адкрыў невядомае сузор'е; |
| 2) Марцін Пачобут-Адляніцкі; | Б) быў спалены за свае погляды ў Варшаве ў 1689 г.; |
| 3) К. Лышчынскі; | В) узначальваў медыцынскую школу ў Гродне; |
| 4) К. Семяновіч. | Г) займаўся кнігадрукаваннем у Амстэрдаме; |
| | Д) вынайшаў спосаб стварэння шматступеньчатых ракет. |

## Частка С

**Дайце азначэнне наступным паняццям:**

**С1.** Вышэйшы шляхецкі саслоўна-прадстаўнічы орган улады ў ВКЛ і РП...

**С2.** Палёгка на некалькі гадоў у выкананні сялянамі феадальных павіннасцей ці іх поўнае скасаванне на пэўны час...

**С3.** Уласна панская гаспадарка, прадукцыя якой прызначалася на продаж...

**С4.** Грашовай адзінкай у ВКЛ, роўнай 6–9 злотым, з'яўляўся...

**С5.** Часовы ваенна-палітычны саюз шляхты Рэчы Паспалітай у XVI–XVIII ст ст. меў назву...

**С6.** *Пазнайце гістарычную асобу*: "А як пачаў цараваць і ў Расійскай дзяржаве, пачаў усталёўваць веру рымскую і грэцкія цэрквы перарабляць у касцёлы ляшскія, і многую непатрэбшчыну чыніць. І таго не маглі сцярпець баяры і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўсялякага чыну людзі. Думалі, чым бы такога зладзейскага цара выкараніць. І па іх задуме хутка тое і здзейснілася: якім звычаем здабыў ён сабе царства і цараваў не па праву, і такая яму хутка смерць дасталася." *Яго імя*…

**С7.** Назавіце першае ў Еўропе міністэрства адукацыі. Гэта ...

**С8.** Напішыце, як называўся пабор, што спаганяўся з сялян за права мець свае жорны і не ездзіць на панскі млын…

**С9.** Прадпрыемства, заснаванае на ручной працы і шырокім яе падзеле, называецца...

**С10.** Філасофскае вучэнне, якое сцвярджае высокую годнасць чалавека, прызнае яго права на зямное шчасце, свабоду чалавечай асобы, прапагандуе ідэалы чалавекалюбства…

**Пісьмовае заданне**

Напішыце адказ на пытанне *"Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у другой палове XVI – канцы XVIII ст."*

## Кантрольная работа № 4

## Тэма: «Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII ст. – 1861 г.)»

### Частка А

**А1. Ці правільна, што прынятая ў Рэчы Паспалітай Канстытуцыя:**
а) ліквідавала права "ліберум вета"? б) ліквідавала выбарнасць караля?
в) заклала асновы для выхаду дзяржавы з палітычнага крызісу?
1) правільна а);
2) правільна б);
3) правільна в);
4) правільныя ўсе варыянты;
5) усе варыянты памылковыя.

**А2. Выберыце з пераліку гады, калі беларускія землі ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі:**
1) 1772;
2) 1791;
3) 1793;
4) 1794;
5) 1795.

**А3. Мінская губерня адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформай у 1801 г. была аднесена да:**
1) Мінскага генерал-губернатарства;
2) Беларускага генерал-губернатарства;
3) Літоўскага генерал-губернатарства;
4) Віленскага генерал-губернатарства.

**А4. Якія новыя падаткі і павіннасці былі ўведзены для жыхароў Беларусі пасля далучэння яе да Расійскай імперыі:**
1) чынш;
2) паншчына;
3) падушны падатак;
4) падымны падатак;
5) рэкруцкая павіннасць;
6) земскі збор.

**А5. Непадаткавая і непрывілеяваная група насельніцтва Расійскай імперыі, што сфарміравалася ў першай палове XIX ст., называлася:**
1) купецтва;
3) разначынцы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) духавенства; 4) пралетарыят.

**А6. Штаб першай рускай арміі напярэдадні вайны 1812 г. знаходзіўся ў:**

1) Вільні; 3) Луцку;
2) Ваўкавыску; 4) Смаленску.

**А7. Праект палажэння «Аб кіраванні аўтаномным ВКЛ» у 1811 г. для Аляксандра I падрыхтаваў:**

1) Т. Зан; 3) А. Чартарыйскі;
2) А. Міцкевіч; 4) М. К. Агінскі.

**А8. Другая руская армія летам 1812 г. адступала па маршруце:**

1) Брэст–Кобрын–Слуцк–Магілёў;
2) Ваўкавыск–Слонім–Слуцк–Бабруйск–Магілёў;
3) Гродна–Мінск–Барысаў–Орша;
4) Вільна–Глыбокае–Полацк–Віцебск.

**А9. Загадам Напалеона 1 ліпеня 1812 г. утвараецца:**

1) Часовы ўрад ВКЛ;
2) Часовы камітэт па справах ВКЛ;
3) дэпартамент ВКЛ;
4) камітэт, які займаўся рэквізіцыямі на акупіраванай тэрыторыі.

**А10. У баі каля мястэчка Клясціцы рускі генерал Кульнёў атрымаў перамогу над маршалам Удзіно. Знайдзіце на карце горад, за які ішлі бai:**

1) 1; 2) 2; 3) 3; 4) 4.



**А11. На тэрыторыі Беларусі войска Напалеона Банапарта панесла самыя значныя страты каля: :**

1) г. Кобрына; 2) в. Студзёнка; 3) в. Ухалоды; 4) г. Полацка.

**А12. Выберыце кіраўніка партызанскага атрада, які ледзь не захапіў пад Ашмянамі Напалеона ў палон:**

1) Леў Грушын; 3) Аляксандр Сяславін;
2) Максім Макараў; 4) Тарас Барысенка.

**А13. Члены польскага "Патрыятычнага таварыства" дамовіліся з дзекабрыстамі "Паўднёвага таварыства" ў выпадку перамогі паўстання аб далучэнні да Польшчы губерняў:**

1) Віцебскай; 3) Гродзенскай;
2) Віленскай; 4) Магілёўскай.

**А14. Кансерватыўны накірунак у паўстанні 1830 – 1831 гг. узначальваў:**

1) М. К. Агінскі; 3) А.Чартарыйскі;
2) І. Лялевель; 4) Э. Плятэр.

**А15. Назва тайнай арганізацыі, якая дзейнічала на беларуска-літоўскіх землях у 40-я гг. XIX ст.:**

1) "Таварыства філаматаў"; 4) "Саюз свабодных братоў";
2) "Таварыства філарэтаў"; 5)"Таварыства з'яднаных славян".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) "Таварыства ваенных сяброў";

**А16. Галоўнай рухаючай сілай паўстання 1830–1831 гг. былі:**

1) сяляне;
2) рабочыя;
3) студэнты;
4) шляхта;
5) мяшчане.

**А17. Згодна з якаснымі характарыстыкамі, глебы Віленскай і Віцебскай губерняў адносіліся да:** а) раёнаў з нізкай урадлівасцю? б) раёнаў з пасрэднай урадлівасцю? в) часткова пладародных раёнаў?

1) правільна а);
2) правільна б);
3) правільна в);
4) правільныя ўсе варыянты;
5) усе варыянты памылковыя.

**А18. Рэформа П. Кісялёва на тэрыторыі Беларусі складалася з наступных частак:**

А) рэформа сістэмы кіравання дзяржаўнай вёскай;
Б) люстрацыя дзяржаўнай маёмасці;
В) адмена паншчыны;
Г) разбор шляхты;
Д) забарона уніяцтва;
Е) палітыка «апякунства» над сялянамі.

**А19. Інструкцыя міністэрства дзяржаўных маёмасцей у 1844 г:**

1) стварала губернскія інвентарныя камітэты;
2) пераводзіла дзяржаўных сялян з паншчыны на чынш;
3) унармавала павіннасці памешчыцкіх сялян;
4) рэкамендавала правесці падрабязны перапіс дзяржаўнай маёмасці.

**А20. У першай палове XIX ст. адставанне гарадской прамысловасці ад вотчыннай было абумоўлена:**

1) нежаданнем сялян пакідаць вёску;
2) больш высокай заработнай платай на вотчынных прадпрыемствах;
3) існаваннем прыгону;
4) асноўныя капіталы і сыравіна знаходзіліся ў руках памешчыкаў.

**А21. Выберыце, якія навучальныя ўстановы былі характэрны для сістэмы адукацыі першай паловы XIX ст.:**

1) гімназіі;
2) рэальныя вучылішчы;
3) павятовыя вучылішчы;
4) народныя вучылішчы;
5) прыходскія вучылішчы.

**А22. У першай палове XIX ст. асноўнымі жанрамі выяўленчага мастацтва ў Беларусі былі:**

1) гістарычны;
2) партрэтны;
3) пейзажны;
4) бытавы

**А23. Аўтарам «Апісання Крычаўскага графства, або былога староства», з'яўляецца:**

1) П. Шпілеўскі;
2) А. Кіркор;
3) Я. Тышкевіч;
4) А. Меер.

**А24. Заснавальнікі навуковай археалогіі ў Беларусі, гісторыкі, этнографы і краязнаўцы:**

1) Ян і Анджэй Снядэцкія;
2) Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы;
3) Іван і Антон Луцкевічы;
4) Павел і Міхал Баброўскія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А25. Вышэйшым дасягненнем беларускай літаратуры XIX ст. па сваім мастацка-вобразным узроўні, культуры верша і мовы стала паэма:** а) "Энеіда навыварат"? б) "Тарас на Парнасе"?
1) правільна а);
2) правільна б);
3) правільныя ўсе варыянты;
4) усе варыянты памылковыя.

**А26. Аўтарам верша "Паштальён", які быў пакладзены ў аснову песні "Когда я на почте служил ямщиком", з'яўляецца:**
1) У. Сыракомля;
2) П. Багрым;
3) Я. Чачот;
4) Ф. Багушэвіч.

**А27. Якія сцвярджэнні з'яўляюцца правільнымі:**
1) у 1836 г. сярод студэнтаў Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі ўзнікла таварыства прамяністых;
2) цэнтрам заснаванай на беларускіх землях каталіцкай епархіі (дыяцэзіі) была Вільня;
3) важнейшым накірункам спецыялізацыі на Гродзеншчыне ў І палове XIX ст. была танкарунная авечкагадоўля;
4) скасаванне Полацкім царкоўным саборам Берасцейскай царкоўнай уніі адбылося напярэдадні шляхецкага паўстання.

**А28. Якія сцвярджэнні з'яўляюцца правільнымі:**
1) "Энеіда навыварат" была напісана ў 10–20-я гг. XIX ст.;
2) зараджэнне новай літаратурнай мовы і станаўленне нацыянальнай беларускай літаратуры пачынаецца ў першай палове XIX ст;
3) беларускія губерні ў 1803 г. былі ўключаны ў склад Беларускай навучальнай акругі;
4) да 20-х гадоў XIX ст. кіраўніком Віленскай вучэбнай акругі з'яўляўся А. Міцкевіч.

**А29. Якія сцвярджэнні з'яўляюцца памылковымі:**
1) рэформа П. Кісялёва значна палепшыла становішча прыгоннага сялянства;
2) на тэрыторыі Беларусі ў 30-я гг. XIX ст. сталі вырошчваць цукровыя буракі;
3) беларускім губерням было характэрна дробнапамеснае дваранскае землеўладанне;
4) у першай палове XIX ст. бульба з агароднай ператвараецца ў палявую культуру.

**А30. Якія сцвярджэнні з'яўляюцца памылковымі:**
1) у 40-я гады XIX ст. у Беларусі з'явіўся такі новы від сувязі, як тэлеграф;
2) першы паравы рухавік з'явіўся ў Беларусі на фабрыках Пуслоўскага ў 20-я гады XIX ст.;
3) сельскай гаспадарцы беларускіх губерняў у першай палове XIX ст. была характэрна спецыялізацыя на мяса-малочнай жывёлагадоўлі;
4) Днепр і Заходнюю Дзвіну ў першай палове XIX ст. злучыў Аўгустоўскі канал.

## Частка В

**В1. Вызначце ў паслядоўнасці:**
1) Прынянцце Канстытуцыі ў Рэчы Паспалітай;
2) Стварэнне Барскай канфедэрацыі;
3) увядзенне мяжы яўрэйскай аселасці;
4) другі падзел Рэчы Паспалітай;
5) Стварэнне Таргавіцкай канфедэрацыі;
6) адмена Канстытуцыі ў Рэчы Паспалітай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**В2. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**
1) бітва паўстанцаў з царскім войскам пад Рацлавіцамі;
2) бітва паўстанцаў з царскім войскам пад Мацяёвіцамі;
3) узяцце Варшавы войскам паўстанцаў;
4) пачатак паўстання ў ВКЛ;
5) Паланецкі універсал.

**В3. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**
1) пераправа арміі Напалеона праз Нёман;
2) бітва каля в. Салтанаўка;
3) бітва на р. Беразіна;
4) Барадзінская бітва;
5) Смаленская бітва.

**В4. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**
1) стварэнне Віленскага цэнтральнага паўстанцкага камітэта;
2) стварэнне таварыства філаматаў;
3) увядзенне Канстытуцыі ў Царстве Польскім;
4) дзейнасць Ю. Бакшанскага сярод тайных студэнцкіх гурткоў Вільні;
5) "Мінскі варыянт" Канстытуцыі М. Мураўёва.

**В5. Суаднясіце паміж сабой:**
1) "разбор шляхты";
2) мяжа аселасці;
3) сервітут;
4) інвентар.

А) права сялян карыстацца зямлёй і лесам памешчыка ў пэўных межах;
Б) тэрыторыя Расійскай імперыі, дзе дазвалялася жыць яўрэям;
В) дакладны ўлік зямель, лясоў, гаспадарчых пабудоў і г. д., што належалі дзяржаве;
Г) дакументальнае пацвярджэнне беларускай шляхтай свайго паходжання;
Д) спіс сялянскіх павіннасцей.

**В6. Суаднясіце паміж сабой:**
1) таварыства філаматаў;
2) тайнае польскае літаратурнае таварыства;
3) таварыства ваенных сяброў;
4) дэмакратычнае таварыства.

А) Ф. Савіч;
Б) Ю.Яжоўскі;
В) Ш. Канарскі;
Г) І. Савініч;
Д) К. Ігельстром.

**В7. Суаднясіце паміж сабой назвы масонскіх лож і гарады, дзе яны дзейнічалі:**
1) Полацк;
2) Магілёў;
3) Вільня.

А) "Добры пастыр";
Б) "Талія";
В) "Геркулес у калысцы";
Г) "Тры арлы";
Д) "Клапатлівы ліцвін".

**В8. Суаднясіце паміж сабой** (Узор адказу: 1АБ,2ВГ і г. д.):
1) Віцебская губ.;
2) Гродзенская губ.;
3) Магілёўская губ.;
4) Мінская губ.

А) Троіцкі;
Б) Любавіцкі;
В) Кантрактавы;
Г) Зэльвенскі;
Д) Камароўскі;
Е) Бешанковіцкі;
Ж) Свіслацкі;
З) Асвейскі.

**В9. Суаднясіце паміж сабой:**
1) інвентарныя правілы;
2) люстрацыя;

А) перыядычнае апісанне дзяржаўнай маёмасці;
Б) адпрацовачная павіннасць сялян на карысць феадалаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| 3) інвентары; | В) дармавая прымусовая праца сялян са сваім інвентаром на зямлі феадала; |
| 4) паншчына. | Г) загады царскага ўрада па рэгуляванні адносін паміж памешчыкамі і прыгоннымі; |
| | Д) вопісы ўладання феадалаў. |

**В10. Суаднясіце паміж сабой** (Узор адказу: 1Аа, 2Бб і г.д.):

| | | |
|---|---|---|
| 1) І. Аляшкевіч; | А) в. Каможыцы (Міншчына); | а) партрэт А. Міцкевіча; |
| 2) Я. Дамель; | Б) в. Захарнічы (Полаччына); | б) замалёўкі на тэмы побыту народаў Сібіры; |
| 3) В. Ваньковіч; | В) двухгадовая ссылка ў Сібір; | в) "Партрэт хлопчыка ў саламяным капелюшы"; |
| 4) І. Хруцкі. | Г) Радашковічы. | г) "А. Міцкевіч на скале Аюдаг". |

### Частка С

**Дайце азначэнне наступным паняццям:**

**С1.** Права, якое давала кожнаму дэпутату сойма ці сойміка сарваць пасяджэнне, калі дэпутут быў не згодны з той ці іншай прапановай...

**С2.** Ідэалогія, якая давала ідэйнае абгрунтаванне пашырэнню капіталістычных адносін у грамадстве...

**С3.** Комплекс мерапрыемстваў царскага ўрада, накіраваных на раздрабленне сіл беларуска-польскага дваранства і падрыў яго магутнасці атрымаў назву...

**С4.** Катэгорыя дзяржаўных сялян, да якой далучалі былую шляхту Рэчы Паспалітай ў Расіі...

**С5.** Напішыце прозвішча прыгоннай сялянкі з в. Пагуршчына, якую царскі ўрад пасля вайны 1812 г. узнагародзіў сярэбраным медалём і грашовай прэміяй...

**С6.** Прадпрыемства, заснаванае на ручной рамеснай тэхніцы і шырокім падзеле працы...

**С7.** Прадпрыемства, заснаванае на выкарыстанні машыннай тэхнікі...

**С8.** Стыль у літаратуры і мастацтве, для якога характэрны зварот да гісторыі і фальклору...

**С9.** Мастацкі стыль, які панаваў у архітэктуры Беларусі ў першай палове XIX ст., называўся...

**С10.** Школы ўзаемнага навучання, што дзейнічалі ў Беларусі ў першай палове XIX ст. і давалі пачатковую адукацыю, называліся...

**Пісьмовае заданне**

Напішыце адказ на пытанне *"Грамадска-палітычны рух на беларускіх землях у канцы XVIII – першай палове XIX ст."*

## Кантрольная работа № 5

## Тэма: «Расійская імперыя ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя»

### Частка А

**А1. Ці правільна, што для паслярэформеннай Беларусі былі характэрны наступныя тыпы вядзення памешчыцкай гаспадаркі:**
а) адпрацовачны, капіталістычны і змешаны? б) інтэнсіўны і экстэнсіўны?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) правільна а);
2) правільна б);
3) абодва сцвярджэнні правільныя;
4) абодва сцвярждэнні няправільныя.

**А2. Пачатак чыгуначнай сетцы Беларусі паклала:**
1) Лібава-Роменская магістраль;
2) Палеская магістраль;
3) Пецярбуржска-Варшаўская магістраль;
4) Пецярбуржска-Адэская магістраль.

**А3. У 90-я гг. XIX ст. галоўнай спецыялізаванай галіной у сельскай гаспадарцы Беларусі стала:**
1) вытворчасць збожжа;
2) свінагадоўля;
3) малочная жывёлагадоўля;
4) бульбаводства.

**А4. Прадстаўнікі рэвалюцыйна-дэмакратычных колаў паўстання 1863 – 1864 гг.:**
1) дэмакраты;
2) лібералы;
3) правыя;
4) левыя.

**А5. Ці правільна, што падчас паўстання 1863 – 1864 гг.:**
а) "правыя" прадугледжвалі надзяленне сялян зямлёй за кошт яе частковай канфіскацыі ў памешчыкаў пры абавязковай грашовай кампенсацыі? б) "левыя" разлічвалі на сялянскую рэвалюцыю?
1) правільна а);
2) правільна б);
3) абодва сцвярджэнні правільныя;
4) абодва сцвярждэнні няправільныя.

**А6. Вызначце лагічную паслядоўнасць:**
А) Роспуск Часовага правінцыяльнага ўрада Літвы і Беларусі і стварэнне Аддзела кіраўніцтва правінцыямі Літвы;
Б) Стварэнне ў Мінску першага сацыял-дэмакратычнага рабочага гуртка на чале з С.Трусевічам;
В) Пачатак дзейнасці II Дзяржаўнай думы;
Г) Выхад у Вільні першага нумара газеты "Наша доля";
1) АБГВ;
2) АВБГ;
3) БВАГ;
4) БГВА.

**А7. Узнікненне самастойнага сацыял-дэмакратычнага руху ў Беларусі звязана з дзейнасцю партыі:**
1) "Народная воля";
2) "Пралетарыят";
3) ППС;
4) ЛСДП.

**А8. У час рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. сіяністы падтрымлівалі:**
1) акцябрыстаў;
2) кадэтаў;
3) эсэраў;
4) чарнасоценцаў.

**А9. Актыўным дзеячам і ідэолагам "западнорусизма" быў:**
1) Л. Саланевіч;
2) Р. Гершуні;
3) А. Булыгін;
4) А. Крэмер.

**А10. З 1912 г. сельскагаспадарчы аддзел газеты "Наша ніва" быў ператвораны ў самастойны часопіс:**
1) "Рала";
2) "Саха";
3) "Беларускі каляндар";
4) "Беларускае жыццё".

**А11. Вызначце лагічную паслядоўнасць:**
А) Перанос Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага расійскай арміяй з Баранавічаў у Магілёў;
Б) Увядзенне земстваў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

В) Заснаванне ў Віцебску настаўніцкага інстытута;
Г) "Свянцянскі прарыў".
1) АБГВ 3) ВБГА
2) БВАГ 4) ГАВБ.

**А12. Ці правільна, што наступленне рэакцыі пасля трэцячэрвеньскага дзяржаўнага перавароту выразілася ў:**
а) закрыцці рэвалюцыйных газет; б) дазволе дзейнасці прафесійных саюзаў
1) правільна а); 3) абодва сцвярджэнні правільныя;
2) правільна б); 4) абодва сцвярджэнні няправільныя.

**А13. Адзін з першых народніцкіх гурткоў у Беларусі ўтварыўся ў 1875 г. у:**
1) Брэсце; 3) Магілёве;
2) Віцебску; 4) Мінску.

**А14. Выразнікамі інтарэсаў сялянства і іншых дробных вытворцаў выступалі:**
1) народнікі; 3) сацыял-дэмакраты;
2) бундаўцы; 4) кадэты.

**А15. Першыя стачкі рабочымі Беларусі былі арганізаваны ў:**
1) другой палове 60-х – пачатку 70-х гг.; 3) другой палове 80-х – пачатку 90-х гг.;
2) другой палове 70-х – пачатку 80-х гг.; 4) другой палове 90-х – пачатку XX ст.

**А16. Паводле закона 1886 г. на фабрычных прадпрыемствах уводзіліся:**
1) стачачныя касы; 3) разліковыя кніжкі;
2) святочныя дні; 4) купоны.

**А17. Ідэі ліберальных народнікаў у Беларусі прапагандавала газета:**
1) "Гоман"; 3) "Наша хата";
2) "Минский листок"; 4) "Белорусская жизнь".

**А18. У вывучэнні гісторыі Віцебшчыны шмат зрабіў гісторык і краязнавец:**
1) А. Дамбавецкі; 3) І. Насовіч;
2) І. Жылінскі; 4) А. Сапуноў.

**А19. Пакажыце горад, у якім 25 – 27 сакавіка 1917 г. адбыўся з'езд прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый:**



1) 1; 2) 2; 3) 3; 4) 4.

**А20. Вызначце правільнае сцвярджэнне:**
1) Рэдактарам газеты "Наша ніва" з сакавіка 1914 г. з'яўляўся Якуб Колас;
2) У кастрычніку 1914 г. расійска-германскі фронт у межах Беларусі ўсталяваўся на лініі Дзвінск – Паставы – Баранавічы – Пінск;
3) Указ Мікалая II ад 9 лістапада 1906 г. дазволіў разбурэнне сялянскай абшчыны і замацаванне надзельнай зямлі ў асабістую ўласнасць сялян;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4) 3 чэрвеня 1905 г. Мікалай II выдаў загад аб роспуску II Дзяржаўнай думы і аб змяненні выбарчага закону;
5) Адным з вядомых прадстаўнікоў гістарычнага жывапісу ў другой палове XIX ст. быў К. Альхімовіч.

**А21. Найвышэйшы, дэмакратычна выбраны орган улады, які мае паўнамоцтвы для вырашэння пытанняў дзяржаўнага і грамадскага ладу краіны, гэта:**

1) Устаноўчы сход;
2) Дзяржаўны Савет;
3) Рэферэндум;
4) Народны сакратарыят.

**А22. Самая ўплывовая рэвалюцыйная арганізацыя ў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст.:**

1) Бунд;
2) РППВР;
3) РСДРП;
4) ЯНРП.

**А23. Вызначце лагічную паслядоўнасць:**

А) Пачатак ажыццяўлення на Беларусі судовай рэформы;
Б) Закрыццё ўладамі Горы-Горацкага земляробчага інстытута;
В) Забойства І. Грынявіцкім расійскага імператара Аляксандра II;
Г) Стварэнне Усеагульнага яўрэйскага рабочага саюза ў Літве, Польшчы і Расіі.

1) АБВГ;
2) БАВГ;
3) ВБГА;
4) ГАВБ.

**А24. У 60 – 90-я гг. асноўнымі тыпамі школ у сістэме пачатковай адукацыі ў сельскай мясцовасці з'яўляліся:**

1) гарадскія вучылішчы;
2) народныя вучылішчы;
3) павятовыя вучылішчы;
4) школы граматы.

**А25. "Наша хата", "Беларус", "Мінчук", "Палачанін" – гэта:**

1) часопісы;
2) выдавецтвы;
3) газеты;
4) арганізацыі.

**А26. Ці правільна, што БСГ сваю агітацыю праводзіла:**

а) у асноўным сярод сялянства? б) у рабочым асяроддзі яе ўплыў быў нязначным?

1) правільна а);
2) правільна б);
3) абодва сцвярджэнні правільныя;
4) абодва сцвярждэнні няправільныя.

**А27. На Беларусі судовая рэформа пачалася з увядзення:**

1) адвакатаў;
2) міравых судоў;
3) міністра юстыцыі;
4) прысяжных засядацеляў.

**А28. Пакажыце горад, у якім ў 1873 г. быў створаны першы прыватны банк на тэрыторыі Беларусі:**



1) 1; 2) 2; 3) 3; 4) 4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А29. Вызначце лагічную паслядоўнасць:**
А) Пуск у Віцебску першага электрычнага трамвая;
Б) Уступленне Расійскай імперыі ў Першую сусветную вайну;
В) "Крывавая нядзеля" і пачатак Першай расійскай рэвалюцыі;
Г) Скасаванне ў Расійскай імперыі рэкруцкага набору і ўвядзенне ўсеагульнай воінскай павіннасці
1) АБВГ;
2) БАВГ;
3) ВБГА;
4) ГАВБ.

**А30. Адкрыццё публічнай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна адбылося ў 1900 г. у:**
1) Віцебску;
2) Мінску;
3) Нясвіжы;
4) Полацку.

## Частка В

**В1. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) К. Кастравіцкі | 1) Бунд |
| Б) С. Трусевіч | 2) РППВР |
| В) Р. Гершуні | 3) СДКПіЛ |
| Г) А. Крэмер. | 4) БРГ |
| | 5) ППС. |

**В2. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) І. Буйніцкі | 1) "Беларускі музычна-драматычны гурток" |
| Б) Ф. Ждановіч | 2) "Першае таварыства беларускай драмы і камедыі" |
| В) А. Бурбіс. | 3) "Русский окраинный союз" |
| | 4) "Першая беларуская трупа". |

**В3.** Дакумент, паводле якога Дзяржаўная дума надзялялася заканадаўчымі паўнамоцтвамі, значна пашыралася колькасць выбаршчыкаў, абвяшчаліся свабода слова, друку, сходаў і г.д. – гэта … .

**В4. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) А. Бурбіс | 1) "Беларусы" |
| Б) Я. Карскі | 2) "Люд беларускі" |
| В) Е. Раманаў | 3) "Кароткі нарыс па эканамічнай геаграфіі Беларусі" |
| Г) М. Федароўскі. | 4) "Кароткая гісторыя Беларусі" |
| | 5) "Беларускі зборнік". |

**В5.** З 1902 г. газета "Минский листок" пачала выходзіць пад назвай … .

**В6. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) Н. Сілівановіч | 1) "Пахаванне Гедыміна" |
| Б) К. Альхімовіч | 2) "Вуліца ў Віцебску" |
| В) Ф. Рушчыц | 3) "Тайная вячэра" |
| Г) Ю. Пэн. | 4) "Вадзяны млын", "Берагі Віліейкі" |
| | 5) "Брама будучыні". |

**В7. Вызначце лагічную паслядоўнасць:**
А) ІІ з'езд РСДРП і яе раскол на бальшавікоў і меншавікоў;
Б) Трэцячэрвеньскі дзяржаўны пераварот і заканчэнне першай рускай рэвалюцыі;

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

В) "Курлоўскі расстрэл";
Г) Стварэнне партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў).

**В8. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) М. Доўнар-Запольскі<br>Б) А. Гараўскі<br>В) Г. Вейсенгоф<br>Г) К. Кастравіцкі. | 1) любіў маляваць хатніх і дзікіх жывёл;<br>2) асабісты сябра рускага мецэната П.Траццякова, дапамагаў у збіранні яго славутай калекцыі;<br>3) таленавіты мастак і пісьменнік, удзельнік беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння, супрацоўнічаў з "Нашай нівай";<br>4) апублікаваў больш за 150 навуковых прац па гісторыі ВКЛ і Расіі, беларускай этнаграфіі, фальклору і літаратуры. |

**В9.** Сусветны эканамічны крызіс, які пачаўся ў 1900 г., станоўча паўплываў на развіццё адной з галоўных галін прамысловасці Беларусі – … .

**В10. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) 1914 г. | 1) Пачатак ажыццяўлення на Беларусі гарадской рэформы; |
| Б) кастрычнік 1905 г. | 2) Прызначэнне М. Мураўёва віленскім генерал-губернатарам; |
| В) 1875 г. | 3) Візіт Мікалая II у Мінск; |
| Г) май 1963 г. | 4) Пачатак Усерасійскай палітычнай стачкі. |

## Частка С

**С1.** Адным з найбольш вядомых прадстаўнікоў беларускай этнаграфіі ў 80 – 90-я гг. XIX ст. з'яўляецца – … .
**С2.** Мастак, майстар бытавога жывапісу, якому за мазаічнае пано "Тайная вячэра" прысвоілі ганаровае званне акадэміка, – гэта … .
**С3.** Форма аб'яднання прадпрымальнікаў, калі яны дамаўляюцца пра ўстанаўленне пэўных аб'ёмаў вытворчасці і адзінай цаны на сваю прадукцыю –...
**С4.** Што аб'ядноўвала рускіх і польскіх шавіністаў у барацьбе супраць беларускага нацыянальнага адраджэння?
**С5.** Аўтар ілюстрацыі вокладак "Беларускі каляндар на 1910 г." і зборніка вершаў К. Буйло "Курганная кветка" – … .
**С6.** Побач з "архітэктурай гістарызму" ў канцы XIX ст. адбываецца станаўленне новага стылю – … .
**С7.** Найбольш вядомы помнік, які спалучае матывы раманскай і гатычнай архітэктуры – …
**С8.** Вызначце, каму належыць выказванне і запішыце прозвішча аўтара: "Мова нашая ёсць такая ж людская і панская, як французская, альбо нямецкая, альбо іншая якая…"
**С9.** Унутранае самакіраванне, якое надаецца цэнтральнай уладай насельніцтву пэўнага рэгіёну для вырашэння ўласных нацыянальных пытанняў, прадугледжвае захаванне мовы, культурных своеасаблівасцей народа – … .
**С10.** Гарадская наземная чыгунка, вагон, які цягнулі запрэжаныя коні. З'явілася ў Мінску ў 1892 г. Гэта … .

**Пісьмовае заданне**
Напішыце адказ на пытанні:
*1.Чаму ідэя сялянскага сацыялізму была ўтапічнай?*
*2. Як паўплываў на сельскую гаспадарку Беларусі аграрны крызіс канца XIX ст.?*

## Кантрольная работа № 6

## Тэма : «Беларусь у першыя гады Савецкай улады»

### Частка А

**А1. Ці правільна, што непасрэднае кіраўніцтва пераходам улады да Саветаў ажыццяўлялі:**

а) створаныя бальшавікамі ваенна-рэвалюцыйныя камітэты? б) ВРК абапіраліся на сялянскія масы?

1) правільна а); 3) абодва сцвярджэнні правільныя;
2) правільна б); 4) абодва сцвярджэнні няправільныя.

**А2. На з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацый у ліпені 1917 г. былі абраны члены Цэнтральнай рады, старшынёй выканаўчага камітэта якой стаў:**

1) У. Ленін; 3) А. Луцкевіч;
2) Я. Лёсік; 4) А. Смоліч.

**А3. Цэнтрам барацьбы с карнілаўшчынай у Беларусі стаў горад:**

1) Баранавічы; 3) Магілёў;
2) Віцебск; 4) Мінск.

**А4. Асноўнае пытанне на Усебеларускім з'ездзе:**

1) аграрнае пытанне;
2) знішчэнне ўсіх рэшткаў феадалізму і ўсталяванне дэмакратычнай рэспублікі;
3) нацыянальнае самавызначэнне беларускага народа;
4) усталяванне савецкай улады на беларускіх землях.

**А5. Часовы рабоча-сялянскага ўрад – Савет Народных Камісараў – узначальваў:**

1) У. Ленін; 3) К. Ландар;
2) А. Мяснікоў; 4) В. Кнорын.

**А6. Ці правільна, што процідзеянне бальшавікам у Мінску аказаў:**

а) КВР Заходняга фронту? б) Першы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета?

1) правільна а); 3) абодва сцвярджэнні правільныя;
2) правільна б); 4) абодва сцвярждэнні няправільныя.

**А7. Пасля звяржэння Часовага ўрада барацьбу з бальшавікамі ўзначаліла Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага рускай арміяй, якая размяшчалася ў:**

1) Баранавічах; 3) Магілёве;
2) Віцебску; 4) Гомелі.

**А8. 2(15) лістапада 1917 г. уладу ў Мінску канчаткова ўзяў у свае рукі:**

1) ВРК Заходняй вобласці і фронту; 3) СНК;
2) Першы рэвалюцыйны полк імя Мінскага Савета; 4) ІІ Усерасійскі з'езд Саветаў.

**А9. Ці правільна, што Выканкам Рады Усебеларускага з'езда выдаў загад №1, у якім заявіў:**

а) пра пераход да яго ўсёй улады? б) пра стварэнне ў Магілёве беларускай ваеннай камендатуры?

1) правільна а); 3) абодва сцвярджэнні правільныя;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) правільна б); 4) абодва сцвярждэнні няправільныя.

**А10. Прэзідыум Рады БНР узначаліў:**

1) Я. Варонка; 3) І. Серада;
2) К. Езавітаў; 4) А. Чарвякоў.

**А11. Аблвыканкамзах склаў свае паўнамоцтвы ў сувязі з абвяшчэннем:**

1) БССР; 3) Літбел;
2) Заходняй вобласці; 4) СССР.

**А12. Далучэнне пры дапамозе сілы адной дзяржавай тэрыторыі (або яе часткі) другой дзяржавы:**

1) авантура; 3) дыктатура;
2) анексія; 4) кантрыбуцыя.

**А13. У выніку першага ўзбуйнення БССР у яе склад не ўвайшлі:**

1) паветы Віцебскай губерні; 3) павет Смаленскай губерні;
2) Рэчыцкі павет; 4) Мінскі павет.

**А14. Ці правільна, што пры выпрацоўцы канкрэтных форм аб'яднання савецкіх рэспублік у адну дзяржаву:**

а) І. Сталін выступаў за федэрацыю, у якой на раўнапраўнай аснове аб'ядноўваліся ўсе савецкія рэспублікі? б) У. Ленін выступаў за "аўтанамізацыю", калі ўсе савецкія рэспублікі павінны былі аб'явіць сябе састаўнымі часткамі РСФСР у яе складзе?

1) правільна а); 3) абодва сцвярджэнні правільныя;
2) правільна б); 4) абодва сцвярджэнні няправільныя.

**А15. Палітыка "ваеннага камунізму" прадугледжвала:**

1) адсутнасць цэнтралізацыі сістэмы кіравання;
2) увядзенне дзяржаўнай хлебнай манаполіі;
3) пераход ад харчразвёрсткі да харчпадатку;
4) свабоду выбару форм землекарыстання;
5) самафінансаванне вытворчасці.

**А16. Дакумент Часовага ўрада Беларусі, які абвясціў стварэнне БССР:**

1) Маніфест; 3) Другая Устаўная Грамата;
2) Першая Устаўная Грамата; 4) Трэцяя Устаўная Грамата.

**А17. Канстытуцыя БССР была прынята на:**

1) 1-ым з'ездзе беларускіх партый і арганізацый у Мінску; 3) Усебеларускім з'ездзе;
2) Паўночна-Заходняй канферэнцыі РКП(б); 4) І Усебеларускім з'ездзе Саветаў.

**А18. Губерні, якія не ўвайшлі ў склад Літбел:**

1) Віленская; 3) Гродзенская;
2) Віцебская; 4) Мінская.

**А19. Горад, які быў захоплены польскімі войскамі 21 красавіка 1919 г.:**

1) Ваўкавыск; 3) Ліда;
2) Вільня; 4) Мінск.

**А20. Спецыяльны палітычны орган – Бюро па нелегальнай рабоце – займаўся:**

1) пашырэннем сеткі школьных устаноў, ліквідацыяй непісьменнасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

2) стварэннем першых калектыўных гаспадарак сялян;
3) нацыяналізацыяй прамысловасці;
4) фарміраваннем партызанскіх атрадаў.

**А21. Якія мерапрыемствы не адносяцца да палітыкі НЭПа:**
1) увядзенне харчпадатку;
2) увядзенне савецкага чырвонца;
3) натуральны абмен прадуктамі;
4) розныя формы аплаты працы;
5) развіццё сельскагаспадарчай кааперацыі.

**А22. Сумесная канферэнцыя прадстаўнікоў партый камуністаў і эсэраў, дзе яны паабяцалі абараняць інтарэсы беларускага народа, адбылася ў:**
1) снежні 1917 г.;
2) лютым 1918 г.;
3) снежні 1919 г.;
4) лютым 1920 г.

**А23. Сувязное звяно паміж камуністычнай і эсэраўскай плынямі партызанскага руху – гэта:**
1) Беларуская вайсковая камісія;
2) Беларуская камуністычная арганізацыя;
3) Беларускі паўстанцкі камітэт;
4) Народная ваенная самаабарона.

**А24. XIV з'езд ВКП(б) прыняў курс на правядзенне:**
1) ваеннага камунізу;
2) індустрыялізацыі;
3) НЭПа;
4) калектывізацыі.

**А25. Аўтар першай "Беларускай граматыкі для школ":**
1) П. Галавач;
2) У. Галубок;
3) Я. Купала;
4) Б. Тарашкевіч.

**А26. Масавая легальная рэвалюцыйна-дэмакратычная арганізацыя, утвораная ў 1925 г. у Заходняй Беларусі:**
1) Беларуская сялянска-рабочая грамада;
2) Беларуская партыя сацыялістаў-федэралістаў;
3) Беларускі нацыянальны камісарыят;
4) Камуністычная партыя Заходняй Беларусі.

**А27. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
А) Другое абвяшчэнне ССРБ;
Б) Пачатак Кастрычніцкай рэвалюцыі;
В) Стварэнне ССРБ;
Г) Абвяшчэнне незалежнасці БНР;
1) АВГБ
2) БГВА
3) ВГАБ
4) ГВБА.

**А28. Новыя галіны прамысловасці, створаныя падчас індустрыялізацыі ў БССР:**
1) машынабудаўнічая;
2) паліўная;
3) хімічная;
4) штучнага валакна.

**А29. Курс на правядзенне калектывізацыі сельскай гаспадаркі распрацаваў:**
1) XII з'езд ВКП(б);
2) XIII з'езд ВКП(б);
3) XV з'езд ВКП(б);
4) XVI з'езд ВКП(б).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А30. Газета – першы і галоўны друкаваны орган бальшавікоў Беларусі, заснаваная ў Мінску ў 1917 г.:**

1) "Дзянніца";
2) "Звязда";
3) "Савецкая Беларусь";
4) "Камуніст".

## Частка В

**В1. Буйнейшая ў 1920 – 1930-я гг. электрастанцыя ў Беларусі – … .**

**В2. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

А) Стварэнне ЛітБел ССР;
Б) Абвяшчэнне БССР;
В) Утварэнне СССР;
Г) Савецка-польская вайна

1) БАГВ
2) АБВГ
3) ВГБА
4) ГВАБ.

**В3. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) У. Ленін | 1) ВРК Заходняга фронту |
| Б) К. Ландар | 2) Аблвыканкамзах |
| В) Т. Калатухін | 3) СНК |
| Г) М. Рагазінскі | 4) Камітэт выратавання рэвалюцыі |
| | 5) Вялікая Беларуская Рада |

**В4. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

А) Адкрыццё БДУ;
Б) Утварэнне Аблвыканкамзаха;
В) Утварэнне Белнацкама;
Г) Мінск стаў сталіцай БССР

1) АВБА
2) БВГА
3) ВГБА
4) ГБВА.

**В5. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) І з'езд КП(б)Б | 1) 9 сакавіка 1918 г. |
| Б) Першая Устаўная Грамата | 2) 1 студзеня 1919 г. |
| В) Другая Устаўная Грамата | 3) 30 снежня 1918 г. |
| Г) Трэцяя Устаўная Грамата | 4) 21 лютага 1918 г. |
| | 5) 25 сакавіка 1918 г. |

**В6. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

А) Захоп г. Мінска польскімі войскамі;
Б) Утварэнне Мінскага губрэўкома на чале з А. Чарвяковым;
В) Стварэнне Беларускай камуністычнай арганізацыі;
Г) Стварэнне Мінскай міліцыі.

1) АВБА;
2) БГВА;
3) ВГАБ;
4) ГАВБ.

**В7. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) З. Жылуновіч | 1) камандуючы Заходнім фронтам |
| Б) А. Чарвякоў | 2) Часовы рабоча-сялянскі Савецкі ўрад Беларусі |
| В) П. Балуеў | 3) Ваенрэўком Беларускай Рэспублікі |
| Г) А. Мяснікоў | 4) Галоўнакамандуючы Заходнім фронтам у лістападзе 1917г. |
| | 5) Старшыня СНК Заходняй вобласці і фронту |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**В8.Вызначце правільную паслядоўнасць:**
А) Стварэнне ВРК Заходняй вобласці і фронту;
Б) І Усебеларускі з'езд Саветаў;
В) Падпісанне Брэсцкага мірнага дагавора;
Г) Падпісанне Рыжскага мірнага дагавора
1) АВБГ; 3) ВГАБ;
2) БАГВ; 4) ГВАБ.

**В9. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) У. Ігнатоўскі<br>Б) Н. Сакалоўскі<br>В) У. Пічэта<br>Г) В. Ластоўскі | 1) Дзяржаўны гімн БССР<br>2) Першы рэктар БДУ<br>3) "Кароткія нарысы гісторыі Беларусі"<br>4) "Кароткая гісторыя Беларусі"<br>5) Заснавальнік геліябіялогіі |

**В10. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) 1922 г.<br>Б) 1924 г.<br>В) 1926 г.<br>Г) 1927 г. | 1) Адкрыццё Віцебскага ветэрынарнага інстытута<br>2) Адкрыццё ў Віцебску БДТ-2<br>3) Адкрыццё Інбелкульту<br>4) Прыняцце Канстытуцыі БССР<br>5) Стварэнне першага беларускага мастацкага фільма |

**Частка С:**

**С1.** Палітыка прымусовага адчужэння ўласнай маёмасці ў спажыванне іншых асоб – гэта … .
**С2.** Форма арганізацыі працы, пры якой адбываецца добраахвотнае аб'яднанне людзей для сумеснай арганізацыі працы, напрыклад, таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі, гандлёвы кааператыў і г. д. – … .
**С3.** Палітычная незалежнасць і самастойнасць дзяржаўнай улады ва ўнутранай і знешняй палітыцы, якая не дапускае замежнага ўмяшання – гэта … .
**С4.** Дзяржава, тэрыторыя якой выкарыстоўваецца ў якасці пагранічнай зоны паміж супрацьлеглымі адна адной краінамі ў мэтах недапушчэння вырашэння іх канфлікту ўзброенным шляхам – … .
**С5.** Сістэма нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў у 1919 – 1921 гг., паводле якой сяляне абавязаны былі здаваць дзяржаве па цвёрдых цэнах усе лішкі сельгаспрадуктаў, што заставаліся звыш нормы, якая была ўстаноўлена на асабістае спажыванне. Неабходнасць харчразвёрсткі была выклікана грамадзянскай вайной і ваеннай інтэрвенцыяй – гэта … .
**С6.** Кінарэжысёр, заснавальнік беларускага савецкага кінематографа. Аўтар карціны "Лясная быль" – … .
**С7.** Першы старшыня ўрада БССР, рэдактар часопіса "Полымя", акадэмік, паэт, драматург – … .
**С8.** Удзельнік барацьбы за ўстанаўленне Савецкай улады ў Беларусі. Член ВРК Заходняга фронту па барацьбе з карнілаўшчынай. У лістападзе 1917 г. – студзені 1918 г. – старшыня СНК Заходняй вобласці і фронту – … .
**С9.** У якім дакуменце было заканадаўча замацавана палажэнне пра тое, што дзякуючы значнай перавазе ў БССР "насельніцтва беларускай нацыянальнасці,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларуская мова прызначалася як мова, пераважная для ўзаемаадносін паміж дзяржавамі, прафесіянальнымі і грамадскімі ўстановамі і арганізацыямі?".
**С10.** Памілаванне, дараванне віны – ...

**Пісьмовае заданне**

Запоўніце табліцу:

| Стварэнне беларускай дзяржаўнасці | | |
|---|---|---|
| Час | Гістарычная падзея | Тэрыторыя дзяржавы |

## Кантрольная работа № 7

### Тэма : «Беларусь у гады Другой сусветнай вайны»

### Частка А

**А1. 10 кастрычніка 1939 г. па ініцыятыве Сталіна было прынята рашэнне аб перадачы Вільні і Віленскага краю:**
1) БССР;
2) Латвіі;
3) Літве;
4) Украіне.

**А2. Сумесны ваенны парад савецкіх і нямецкіх войскаў 22 верасня 1939 г. адбыўся ў:**
1) Брэсце;
2) Баранавічах;
3) Варшаве;
4) Беластоку.

**А3. Хто з кіраўнікоў СССР узначаліў Дзяржаўны Камітэт Абароны?**
1) Л. Берыя;
2) К. Варашылаў;
3) В. Молатаў;
4) І. Сталін.

**А4. У апаведнасці з якім планам ставілася задача разграміць СССР у маланкавай кампаніі?**
1) "Барбароса";
2) "Ост";
3) "Вайс";
4) "Рот".

**А5. Да канца 1943 г. быў вызвалены наступны абласны цэнтр БССР:**
1) Брэст;
2) Віцебск;
3) Гомель;
4) Мінск.

**А6. Медаль, які быў ўстаноўлены 1 жніўня 1939 г. і ўручаўся асобам, удастоеным звання Героя Савецкага Саюза:**
1) "За адвагу";
2) "За баявыя заслугі";
3) "Залатая Зорка";
4) "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг".

**А7. Першыя савецкія партызаны, якім было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, кіраўнікі атрада "Чырвоны Кастрычнік":**
1) У. Бумажкоў;
2) П. Панамарэнка;
3) Ф. Паўлоўскі;
4) П. Калінін.

**А8. Ці правільна, што згодна з савецка-германскім гандлёвым дагаворам:**
а) СССР атрымаў крэдыт для закупкі ў Германіі машын, абсталявання, аптычных прыбораў, а сам пастаўляў у Германію лес, нафту і каляровыя металы? б) у пачатку вайны СССР працягваў пастаўкі ў Германію, а Германія іх спыніла?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) правільна а); 3) абодва сцвярджэнні правільныя;
2) правільна б); 4) абодва сцвярджэнні няправільныя.

**А9. 14 ліпеня 1941 г. пад Оршай упершыню быў нанесены ўдар па ворагу батарэяй рэактыўных установак “Кацюша” пад камандаваннем:**
1) А. Гарадавікова; 3) П. Курачкіна;
2) Л. Пятроўскага; 4) І. Флёрава.

**А10. На пяты дзень вайны ўзнік партызанскі атрад пад камандаваннем:**
1) П. Калініна; 3) Ф. Паўлоўскага;
2) В. Каржа; 4) М. Шмырова.

**А11. Савецкая наступальная аперацыя па вызваленні тэрыторыі Беларусі:**
1) “Баграціён”; 3) “Кутузаў”;
2) “Барбароса”; 4) “Тайфун”.

**А12. Першая партызанская зона ўзнікла ў:**
1) Лепельскам раёне Віцебскай вобласці; 3) Кастрычніцкім раёне Палескай вобласці;
2) Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці; 4) Слуцкім раёне Мінскай вобласці.

**А13. У снежні 1943 г. Беларускую Цэнтральную раду ўзначаліў:**
1) Р. Астроўскі; 3) Ф. Кушаль;
2) Ф. Крыловіч; 4) С. Прытыцкі.

**А14. Першыя ганаровыя грамадзяне, вызваліцелі Мінска:**
1) А. Бурдзейны; 3) Б. Коўзан;
2) М. Гастэла; 4) Дз. Фролікаў.

**А15. Абаронцы Брэсцкай крэпасці:**
1) А. Бурдзянюк; 4) І. Зубачоў;
2) П. Гаўрылаў; 5) Я. Фамін.
3) А. Данілаў;

**А16. Стваральнік 1-й Беларускай партызанскай брыгады:**
1) К. Заслонаў; 3) П. Машэраў;
2) В. Корж; 4) М. Шмыроў.

**А17. Хто з кіраўнікоў СССР выступіў 22 чэрвеня 1941 г. са зваротам да савецкага народа?**
1) Л. Берыя; 3) Варашылаў;
2) В. Молатаў; 4) І. Сталін.

**А18. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў склад БССР уваходзіла:**
1) 5 абласцей і 150 раёнаў; 3) 8 абласцей і 174 раёны;
2) 6 абласцей і 162 раёны; 4) 10 абласцей і 188 раёнаў.

**А19. Назавіце вобласці, якія былі ўтвораны ў Заходняй Беларусі пасля ўз'яднання яе з БССР:**
1) Віцебская, Брэсцкая, Вілейская, Маладзечанская, Мінская;
2) Баранавіцкая, Брэсцкая, Вілейская, Пінская, Беластоцкая;
3) Віцебская, Віленская, Маладзечанская, Мінская, Палеская;
4) Брэсцкая, Гродзенская, Маладзечанская, Мінская, Палеская.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А20. Напярэдадні вайны на тэрыторыі Беларусі ўмацоўвалася новая граніца, уздоўж якой былі пабудаваны 193 баявыя ўмацаванні:**
1) "лінія Зігфрыд"; 3) "Готская лінія";
2) "лінія Молатава"; 4) "лінія Усходняя".
**А21. У партызанскіх атрадах была наладжана вытворчасць мін з неўзарваных бомб і снарадаў. Іх называлі:**
1) "выбухоўкі"; 3) "партызанскія нарыхтоўкі";
2) "мінныя майстэрні"; 4) "чортавы кухні".
**А22. Тэрытарыяльна-адміністрацыйная адзінка, створаная ў 1941 г. фашыстамі на тэрыторыі акупіраванай Беларусі, якая складала 1/3 тэрыторыі БССР:**
1) Генеральная акруга Беларусь; 3) Генеральная акруга Літва;
2) генеральны камісарыят Беларусь; 4) гебіт.
**А23. "Камітэт садзеяння Чырвонай Арміі", які ўзначальваў К. Мэтэ, – гэта:**
1) Вышэйшы орган стратэгічнага кіраўніцтва Узброенымі Сіламі СССР;
2) Магілёўская падпольная арганізацыя;
3) Мінскі падпольны гарком КП(б)Б;
4) Орган матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння войск.
**А24. Камсамольская арганізацыя ў пасёлку Обаль Віцебскай вобласці, створаная вясной 1942 г.:**
1) "Армія Краёва"; 3) "Патрыёты";
2) "Маладая гвардыя"; 4) "Юныя мсціўцы".
**А25. На тэрыторыі Беларусі германскія агрэсары стварылі моцную, глыбокую (да 270 км) лінію абароны:**
1) "Актава"; 3) "Манергейма";
2) "Мажына"; 4) "Фатэрлянд".
**А26. Лепшы танк перыяду Другой сусветнай вайны – Т-34 – быў сканструяваны:**
1) С. Ільюшыным; 3) А. Тупалевым;
2) М. Кошкіным; 4) А. Якаўлевым.
**А27. Першая карная аперацыя фашыстаў на Беларусі:**
1) "Арол"; 3) "Прыпяцкія балоты";
2) "Котбус"; 4) "Чароўная флейта".
**А28. Загад № 227, 1942 г.:**
1) асобы, якія здаліся ў палон, лічыліся здраднікамі Радзімы;
2) "Ні кроку назад!" – стварэнне штрафных рот і батальёнаў, загараджальных атрадаў;
3) пачатак стварэння гвардзейскіх часцей у Чырвонай Арміі;
4) правядзенне масавай мабілізацыі.
**А29. Беларускую надзвычайную дзяржаўную камісію па выяўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў, іх саўдзельнікаў і прычыненых імі страт грамадзянам, калгасам, грамадскім арганізацыям, дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам узначаліў:**
1) І. Ахрэмчык; 3) П. Панамарэнка;
2) П. Калінін; 4) К. Мазураў.

**А30. Парадам Перамогі камандаваў:**

1) А. Васілеўскі;
3) Г. Жукаў;
2) Г. Захараў;
4) К. Ракасоўскі.

## Частка В

**В1. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

А) Выключэнне СССР з Лігі Нацый за агрэсію супраць Фінляндыі;
Б) Напад Германіі на СССР;
В) Рашэнне аб уключэнні БССР у склад ААН;
Г) Адкрыццё ў Мінску Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

1) АБГВ
3) ВГБА
2) БАВГ
4) ГВАБ.

**В2. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) В. Харужая | 1) Асіповічы |
| Б) К. Заслонаў | 2) Брэст |
| В) Ф. Крыловіч | 3) Віцебск |
| Г) У. Амельянюк | 4) Мінск |
| | 5) Орша |

**В3. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

А) Парад партызан у Мінску, прысвечаны вызваленню сталіцы;
Б) Стварэнне Цэнтральнага штаба партызанскага руху;
В) Пачатак першага этапа ваенна-стратэгічнай аперацыі "рэйкавая вайна";
Г) Стварэнне Стаўкі Галоўнага Камандавання

1) АБГВ
3) ВГАБ
2) БАВГ
4) ГБВА.

**В4. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) 1-ы Беларускі фронт | 1) І. Баграмян |
| Б) 2-і Беларускі фронт | 2) Г. Захараў |
| В) 3-і Беларускі фронт | 3) К. Ракасоўскі |
| Г) 1-ы Прыбалтыйскі фронт | 4) І. Чарняхоўскі |

**В5. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

А) Стварэнне Беларускага штаба партызанскага руху;
Б) Утварэнне Народнага камісарыята замежных спраў;
В) Пачатак аперацыі "Канцэрт";
Г) Вызваленне савецкімі войскамі Брэста.

1) АВБГ
3) ВГАБ
2) БАВГ
4) ГБВА.

**В6. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) П. Рак | 1) першы танк, які па замініраваным мосце цераз р. Бярэзіну прарваўся ў Барысаў |
| Б) Дз. Фролікаў | 2) першы танк, які ўварваўся ў Мінск |
| В) А. Гаравец | 3) збіў 9 варожых самалётаў у адным баі |
| Г) Т. Лук'яновіч | 4) выратаваў нямецкую дзяўчынку пры штурме Берліна, а сам быў смяротна паранены |
| | 5) беларускі снайпер, які змагаўся на Ленінградскім фронце |



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**В7. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
А) Адна з буйнейшых танкавых бітваў у пачатку Вялікай Айчыннай вайны на Віцебшчыне;
Б) Дагавор "Аб дружбе і граніцы" паміж СССР і Германіяй;
В) Пераход Чырвонай Арміяй савецка-польскай мяжы і пачатак вызвалення тэрыторыі Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі;
Г) З'яўленне партызанскіх брыгад.

1) АВГБ
2) БАВГ
3) ВБАГ
4) ГБВА.

**В8. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) А. Данілаў<br>Б) В. Коўзан<br>В) І. Русіянаў<br>Г) С. Куцепаў | 1) камандзір экскадрыллі знішчальнага палка, які ўступіў у адзінаборства з дзевяццю "месершмітамі"<br>2) адзіны ў свеце лётчык, які зрабіў тры тараны і застаўся жывым;<br>3) камандзір 100-й стралковай дывізіі, якая прымала ўдзел у абароне Мінска;<br>4) камандзір стралковага палка, які вылучыўся пры абароне Магілёва;<br>5) асабіста зняў 12 зарадаў з авіябомб, размешчаных на розных паверхах будынка Дома ўрада |

**В9. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
А) Правядзенне аперацыі "Котбус";
Б) Забойства мінскімі падпольшчыкамі гаўляйтэра В. Кубэ;
В) Падпісанне савецка-германскага гандлёвага дагавора;
Г) Прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўнай уладзе і аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР.

1) АГВБ
2) БАВГ
3) ВГАБ
4) ГБВА.

**В10. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) 22.06. – 20.07.1941 г.<br>Б) 03.07. – 26.07.1941 г.<br>В) 05.07. – 11.07.1941 г.<br>Г) 08.01. – 08.02.1944 г. | 1) абарона Брэсцкай крэпасці<br>2) баі ў раёне Магілёва<br>3) абарона Віцебска<br>4) Калінкавіцка-Мазырская аперацыя. |

## Частка С

**С1.** Галоўныя мэты і задачы германскай эканамічнай палітыкі ў СССР былі адлюстраваны ў спецыяльных "дырэктывах", пад кодавай назвай …
**С2.** Своеасаблівы гімн Вялікай Айчыннай вайны – песню-набат "Свяшчэнная вайна" – стварылі кампазітар … і паэт …
**С3.** Савецкі военачальнік, генерал арміі. У чэрвені – ліпені 1944 г. пад яго камандаваннем войскі 2-га Беларускага фронту ўдзельнічалі ў вызваленні Беларусі. Гэта …
**С4.** Ураджэнец Гомельшчыны, камандзір танкавых рот, якія праславіліся пры штурме Берліна і вызваленні Прагі. Яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Адна з вуліц беларускай сталіцы названа ў яго гонар – …

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**С5.** Знішчэнне нацыстамі яўрэйскага насельніцтва Еўропы ў гады Другой сусветнай вайны – …
**С6.** Дзеянні з мэтай поўнага ці частковага знішчэння той ці іншай нацыі (народа) – …
**С7.** Сукупнасць узброенай, эканамічнай і ідэалагічнай форм барацьбы насельніцтва захопленых краін супраць германскага акупацыйнага рэжыму за свабоду і нацыянальна-дзяржаўную незалежнасць – …
**С8.** Добраахвотны ўдзельнік узброенай барацьбы на тэрыторыі, занятай праціўнікам – …
**С9.** Антываенны рух, удзельнікі якога выступаюць супраць усялякай вайны – …
**С10.** Умоўная назва сістэмы ваенна-паліцэйскіх, сацыяльна-эканамічных і ідэалагічных мерапрыемстваў, накіраваных на падтрымку дзяржаўнага ладу нямецка-фашысцкіх захопнікаў на акупіраваных землях – …

**Пісьмовае заданне**

1. Складзіце табліцу: *“Вызваленне Беларусі”*
2. У Беларусі створана шмат мемарыяльных комплексаў, якія ўвекавечылі подзвігі савецкіх воінаў і партызан. *Назавіце іх і растлумачце, якой падзеі яны прысвечаны.*

## Кантрольная работа № 8

## Тэма : «Беларусь у пасляваенныя гады. Шлях да суверэнітэту»

### Частка А

**А1. Аднаўленне эканомікі Беларусі пачалося ў:**
1) 1943 г.; 3) 1946 г.;
2) 1945 г.; 4) 1947 г.

**А2. У БССР пасаду першага сакратара ЦК КПБ займаў з 1956 г.:**
1) А. Грамыка; 3) П. Машэраў;
2) К. Мазураў; 4) С. Прытыцкі.

**А3. БССР была ўзнагароджана ордэнам Леніна ў:**
1) 1935 г.; 3) 1958 г.;
2) 1945 г.; 4) 1968 г.

**А4. Ці правільна, што 11 сакавіка 1957 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў закон, паводле якога:**
а) рэспублікі самі не маглі вырашаць пытанні абласнога і краявога адміністрацыйна-тэрытарыяльнага будаўніцтва; б) пашыраліся заканадаўчыя правы саюзных рэспублік?
1) правільна а); 3) абодва сцвярджэнні правільныя
2) правільна б); 4) абодва сцвярджэнні няправільныя.

**А5. Творы, якія былі адзначаны Сталінскай прэміяй:**
1) “Новае рэчышча”; 3) “Сасна пры дарозе”;
2) “Рыбакова хата”; 4) “Хлеб”.

**А6. Сусветна вядомыя беларускія лётчыкі-касманаўты СССР, якія ўнеслі ўклад у асваенне космасу:**
1) У. Кавалёнак; 3) В. Церашкова;
2) П. Клімук; 4) У. Лебедзеў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**A7. Ці правільна, што выбары ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь 1995 г. садзейнічалі:**

а) актывізацыі дзейнасці палітычных партый; б) пашырэнню колькасці палітычных партый?

1) правільна а); 3) абодва сцвярджэнні правільныя;
2) правільна б); 4) абодва сцвярджэнні няправільныя.

**A8. У 1968 г. адкрылася Выстаўка дасягненняў народнай гаспадаркі Беларусі ў горадзе:**

1) Брэсце; 3) Мінску;
2) Віцебску; 4) Полацку.

**A9. 25 жніўня 1991 г. у гісторыі Беларусі адбылася наступная падзея:**

1) Прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР;
2) Наданне статусу канстытуцыйнага Закона Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР;
3) Прыняцце Закона "Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР";
4) Зацвярджэнне назвы дзяржавы "Рэспубліка Беларусь" і сімволікі.

**A10. Ніжэйшая палата беларускага парламента:**

1) Савет Рэспублікі; 3) Вярхоўны Савет;
2) Палата Прадстаўнікоў; 4) Савет Міністраў.

**A11. Пытанні, якія не разглядаліся на Першым агульнарэспубліканскім рэферэндуме:**

1) наданне рускай мове роўнага статусу з беларускай;
2) змена дзяржаўнай сімволікі;
3) эканамічная інтэграцыя з Расійскай Федэрацыяй;
4) прыняцце новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;
5) перанясенне Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

**A12. Ці правільна, што эканамічнымі вынікамі рэформ 1992 – 1994 гг. былі:**

а) захаванне раней існуючых сувязей паміж прадпрыемствамі і аб'яднаннямі? б) спад вытворчасці больш чым на 50 %?

1) правільна а); 3) абодва сцвярджэнні правільныя;
2) правільна б); 4) абодва сцвярджэнні няправільныя

**A13. Хто з пералічаных ніжэй асоб не з'яўляецца беларускім кампазітарам:**

1) У. Буднік; 3) І. Лучанок;
2) В. Іваноўскі; 4) В. Раеўскі.

**A14. Уздыму ўзроўню майстэрства маладых выканаўцаў садзейнічаў фестываль, які з 1993 г. праводзіцца ў:**

1) Віцебску; 3) Маладзечне;
2) Магілёве; 4) Полацку.

**A15. 8 снежня 1991 г. у Белавежскай пушчы быў дэнансаваны дагавор 1922 г. аб утварэнні СССР кіраўнікамі:**

1) Беларусі, Расіі, Украіны;
2) Беларусі, Расіі, Казахстана;
3) Расіі, Украіны, Малдовы;
4) Латвіі, Літвы, Эстоніі.

**A16. Першы і апошні прэзідэнт СССР:**

1) Ю. Андропаў; 3) А. Грамыка;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) М. Гарбачоў; 4) С. Шушкевіч.

**А17. У 1947 г. пераехаў з Гродна ў Мінск і пачаў сваю дзейнасць:**

1) Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі;
2) Рускі драматычны тэатр БССР;
3) Тэатр-студыя кінаакцёра;
4) Беларускі вандроўны тэатр.

**А18. Выканаўчую ўладу ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляе:**

1) Савет Міністраў;
2) Савет Рэспублікі;
3) Прэзідэнт;
4) Палата прадстаўнікоў.

**А19. Назавіце асноўныя прыярытэты знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь:**

1) садзейнічанне будаўніцтву новай сусветнай і еўрапейскай сістэмы бяспекі;
2) шматбаковае міжнароднае супрацоўніцтва;
3) актыўны ўдзел у працы міжнародных арганізацый;
4) інтэграцыя.

**А20. Другая ступень вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, арыентаваная на навуковую падрыхтоўку і навукова-педагагічную дзейнасць:**

1) аспірантура; 3) курсы павышэння кваліфікацыі;
2) дактарантура; 4) магістратура.

**А21. Першай спробай рэфармаваць сельскую гаспадарку з'явіліся рашэнні вераснёўскага (1953 г.) Пленума ЦК КПСС. Згодна з імі:**

1) з калгасаў і саўгасаў была спісана запазычанасць;
2) зніжаны нарыхтоўчыя і закупачныя цэны на сельгаспрадукты;
3) зніжаны падатак на падсобныя сялянскія гаспадаркі;
4) уведзены дадатковыя выхадныя дні;
5) старая тэхніка замянялася новай.

**А22. На базе якога завода ў Беларусі было створана Беларускае оптыка-механічнае аб'яднанне (БелОМА):**

1) Прыборабудаўнічага завода імя У. І. Леніна;
2) Мінскага механічнага завода імя С. І. Вавілава;
3) Брэсцкага электралямпавага завода;
4) вытворчага аб'яднання "Інтэграл".

**А23. Помнік ахвярам Мінскага гета, пабудаваны ў 2000 г. па праекце архітэктара:**

1) А. Вараксіна; 3) І. Лангбарда;
2) А. Воінава; 4) Л. Левіна.

**А24. Да негатыўных з'яў у эканоміцы БССР у 1970-х – першай палове 1980-х гг. адносіліся:**

1) значныя зрухі ў інтэнсіфікацыі вытворчасці;
2) павелічэнне спажывання сыравіны і паліва;
3) падзенне тэмпаў росту вытворчасці;
4) увядзенне элементаў рыначнай эканомікі.

**А25. Пасля XX з'езда КПСС у грамадска-палітычным жыцці БССР адбывалася:**

1) будвўніцтва "развітога сацыялізму";
2) рэабілітацыя ахвяр палітычных рэпрэсій;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) узмацненне рэпрэсій;
4) фарміраванне шматпартыйнасці.

**А26. У гады "застою" адзін з вядомых беларускіх пісьменнікаў быў абвінавачаны ў паклёпе на Савецкую армію:**

1) В. Быкаў;
2) І. Мележ;
3) І. Чыгрынаў;
4) І. Шамякін.

**А27. Працэс ухвалення рэспублікамі былога Савецкага Саюза Дэкларацый аб незалежнасці на працягу 1990 гг.:**

1) камасацыя;
2) парцэляцыя
3) "парад суверэнітэтаў";
4) "развіты сацыялізм".

**А28. Аўтар слоў дзяржаўнага гімна БССР:**

1) А. Адамовіч;
2) Р. Барадулін;
3) М. Клімковіч;
4) Н. Сакалоўскі.

**А29. Сацыяльна-эканамічнаму развіццю Беларусі ў канцы 1990-х – пачатку 2000-х гг. адпавядае:**

1) поўная ліквідацыя інфляцыі;
2) распрацоўка мадэлі сацыяльна-арыентаванай рыначнай эканомікі;
3) сістэматычнае павышэнне заработнай платы работнікам бюджэтнай сферы;
4) "шокавая тэрапія" ў эканоміцы.

**А30. Прызнанне існавання мноства поглядаў, думак, меркаванняў па пытанні пра шляхі развіцця грамадства і дзяржавы – гэта...**

1) галоснасць;
2) дэмакратыя;
3) валюнтарызм;
4) плюралізм.

## Частка В

**В1. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

А) Выпуск на Мінскім трактарным заводзе першага калёснага трактара "Беларусь";
Б) Адмена ў БССР картачнай сістэмы;
В) Ліквідацыя МТС;
Г) Пуск у Беларусі першага атамнага рэактара;

1) АБВГ
2) БАВГ
3) ВГБА
4) ГВАБ.

**В2. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) А. Куляшоў | 1) "Атланты і карыятыды" |
| Б) М. Лынькоў | 2) "Векапомныя дні" |
| В) І. Мележ | 3) "Новае рэчышча" |
| Г) І. Шамякін | 4) "Мінскі напрамак" |
| | 5) "Каласы пад сярпом тваім" |

**В3. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

А) Выбранне П. Машэрава на пасаду Першага сакратара ЦК КПБ;
Б) Адкрыццё мемарыяльнага комплексу "Хатынь";
В) Адкрыццё мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой";
Г) Пачатак працы Мінскага метрапалітэна

1) АБВГ;
2) БАВГ;
3) ВГБА;
4) ГВАБ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**В4. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) XX з'езд КПСС | 1) праграма пабудовы камунізму |
| Б) XXII з'езд КПСС | 2) рэабілітацыя ахвяр рэпрэсій |
| В) XXIV з'езд КПСС | 3) узнікненне новай гістарычнай супольнасці людзей |
| Г) Пленум ЦК КПСС 1995 г. | 4) праблемы інтэлектуальнай уласнасці |
| | 5) аграрная палітыка |

**В5. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

А) Увядзенне савецкіх войск у Афганістан;

Б) Падпісанне БССР Маскоўскай дамовы аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў атмасферы, пад вадой, у космасе;

В) Увядзенне ў эксплуатацыю міжнароднага нафтапровада "Дружба";

Г) Зацвярджэнне ў СССР "Харчовай праграмы"

1) АБВГ; 3) ВГБА;

2) БВАГ; 4) ГВАБ.

**В6. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) 14 мая 1995 г. | 1) Першы агульнарэспубліканскі рэферэндум |
| Б) май 2001 г. | 2) Трэці Усебеларускі народны сход |
| В) кастрычнік 2004 г. | 3) Другі Усебеларускі народны сход |
| Г) сакавік 2006 г. | 4) Трэці агульнарэспубліканскі рэферэндум |
| | 5) Другі агульнарэспубліканскі рэферэндум |

**В7. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

А) Пачатак палітыкі "перабудовы";

Б) Аварыя на Чарнобыльскай АЭС;

В) Вывад савецкіх войск з Афганістана;

Г) Абранне на пасаду Генеральнага сакратара ЦК КПСС Ю. Андропава

1) АБГВ; 3) ВГБА;

2) БВАГ; 4) ГАБВ.

**В8. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

А) Пачатак выпуску прадукцыі Мінскім заводам халадзільнікаў;

Б) Прысваенне Мінску звання "Горад-герой";

В) Адкрыццё аэрапорта міжнароднага класса "Мінск-2";

Г) Адмена Вярхоўным Саветам БССР часовага прыпынення дзейнасці КПБ – КПСС

1) АБВГ; 3) ВГБА;

2) БВАГ; 4) ГВАБ.

**В9. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

А) Першы Усебеларускі народны сход у Мінску;

Б) Візіт прэзідэнта ЗША Б. Клінтана ў Беларусь;

В) Увядзенне ў абарачэнне разліковых білетаў Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь;

Г) Падпісанне ў Маскве Дамовы аб Саюзе Беларусі і Расіі

1) АБГВ; 3) ВБАГ;

2) БВАГ; 4) ГВБА.

**В10. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) Я. Зайцаў | 1) "Мінск 3 ліпеня 1944 г." |
| Б) В. Волкаў | 2) "За родную Беларусь" |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| В) У. Сухаверхаў<br>Г) У. Хрусталёў | 3) “Канстанцін Заслонаў”<br>4) “Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 г.”<br>5) “Палонных вядуць” |

### Частка С

**С1.** Поўная ці частковая кампенсацыя, аплата матэрыяльных страт ад вайны дзяржавай, якая здзейсніла агрэсію, той краіне, якая падвяргалася агрэсіі – …
**С2.** Метад гаспадарання, пры якім прадпрыемства не атрымлівае фінансавых сродкаў з дзяржбюджэту, а зарабляе грошы само, за кошт сваёй вытворчасці і рэалізацыі яе вырабаў – …
**С3.** Сістэма поглядаў чалавека на свет (прыроду, людзей, грамадства, заканамернасці яго развіцця), якія выражаюць яго асабістыя адносіны да навакольнай рэчаіснасці – …
**С4.** Група дэпутатаў, чые погляды не супадаюць альбо супярэчаць думкам дэпутацкай большасці – …
**С5.** Абясцэньванне грошай у выніку выпуску іх у зварот без забеспячэння неабходнай колькасцю тавараў, падзенне пакупной здольнасці грошай – …
**С6.** Урадлівая, але неапрацаваная глеба – …
**С7.** Група членаў палітычнай партыі, якая праводзіць яе палітыку ў парламенце, або групоўка ўнутры партыі, погляды якой не супадаюць з генеральнай (асноўнай) лініяй партыі – …
**С8.** Паведамленне адной дзяржавы другой аб скасаванні дзеяння, падпісанага паміж імі – …
**С9.** Зацвярджэнне органамі вярхоўнай дзяржаўнай улады міжнароднага дагавора або пагаднення, пасля чаго гэты дакумент набывае юрыдычную (прававую) сілу – …
**С10.** У 2000 г. стаў лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па фізіцы, ўраджэнец Беларусі.. …

**Пісьмовае заданне**
*Назавіце асаблівасці правядзення рыначных рэформ у Беларусі ў 1994 – 1999 гг.*

## Кантрольная работа № 9

### Тэма: «Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да сучаснасці» (выніковая)

### Частка А

**А1. Выберыце, якімі крамянёвымі прыладамі працы карысталіся першыя насельнікі беларускіх зямель:**

1) лук са стрэламі;
2) скрабкі;
3) востраканечнікі;
4) каменныя сякеры;
5) палкі-капалкі;
6) ручныя рубілы.

**А2. Вызначце тыя археалагічныя культуры, якія існавалі ў Беларусі на працягу ўсяго жалезнага веку:**

1) днепра-дзвінская;
2) мілаградская;
4) штрыхаванай керамікі;
5) кіеўская археалагічная культура.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) паморская;

**А3. У IX–XI стст. ва ўсходніх славян суіснавалі гаспадарчыя ўклады:**

1) першабытнаабшчынны; 3) феадальны;
2) рабаўладальніцкі; 4) капіталістычны.

**А4. Царква – гэта:**

1) рэлігійная арганізацыя, якая аб'ядноўвае паслядоўнікаў хрысціянскай веры;
2) дзяржаўная арганізація, якая аб'ядноўвае хрысціян;
3) будынак для хрысціянскага набажэнства;
4) месца, дзе жывуць манахі.

**А5. Што з пералічанага можна аднесці да наступстваў палітычнай раздробленасці ўсходнеславянскіх зямель:**

1) развіццё памешчыцкага землеўладання;
2) развіццё гаспадаркі і культуры асобных зямель;
3) развіццё рамяства і з'яўленне мануфактурнай вытворчасці;
4) узмацненне абараназдольнасці асобных княстваў.

**А6. Што з пералічанага можна аднесці да прычын фарміравання ВКЛ:**

1) прыняцце адпаведнага тытула вялікім князем;
2) узвелічэнне эканамічнай і палітычнай ролі Наваградка;
3) знешняя небяспека;
4) захоп беларускіх зямель літоўскім князем Міндоўгам.

**А7. Выберыце з пералічанага унію (-і), што заключаліся паміж ВКЛ і Польшчай**:

1) Крэўская; 4) Віленска-Радамская;
2) Кейданская; 5) Кальмарская.
3) Гарадзельская;

**А8. Пра развіццё таварна-грашовых адносін у ВКЛ сведчыць існаванне:**

1) паншчыны; 3) натуральнай гаспадаркі;
2) чыншу; 4) фальваркаў.

**А9. Які (-я) горад (гарады) атрымалі магдэбургскае права ў час праўлення Кізіміра IV:**

1) Мінск; 4) Слуцк;
2) Полацк; 5) Вільня.
3) Бярэсце;

**А10. Пакажыце на карце горад, які стаў цэнтрам самага значнага выступлення супраць дзяржаўнай улады ў ВКЛ у XVI ст.:**

1) 1; 2) 2; 3) 3; 4) 4.



**А11. Да сярэдзіны XVI ст. сялянскія надзелы ў ВКЛ называліся па-рознаму. Выберыце ў пераліку лішняе:**

1) жарэб'е; 2) угайнае; 3) службы; 4) дым.

**А12. Аграрная рэформа 1557 г. прывяла да распаўсюджвання ў Беларусі:**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) замкнутай кампазіцыйна-архітэктурнай планіроўкі;
2) вяночнай планіроўкі;
3) вулічнай планіроўкі;
4) рассеянай планіроўкі.

**А13. "Трэнас" – публіцыстычны твор, напісаны ў форме плачу – водгук на пагромы праваслаўных манастыроў і цэркваў у Вільні ў 1609 г. Яго аўтар:**
1) Іпацій Пацей; 3) Васіль Цяпінскі;
2) Мялецій Сматрыцкі; 4) Сымон Будны.

**А14. Якія сцвярджэнні з'яўляюцца памылковымі:**
1) вайсковая адзінка ў ВКЛ, сцяг гэтай адзінкі называўся харуства;
2) на р.Стрэве войска ВКЛ было разбіта;
3) першым мітрапалітам Літоўскай мітраполіі патрыярх прызначыў Рыгора Цамблака;
4) шляхта і магнаты ВКЛ падтрымалі Рэфармацыю, бо разлічвалі спыніць акаталічванне насельніцтва.

**А15. У 1-й палове XIX ст. большасць прадпрыемстваў мануфактурнай і машыннай вытворчасці ў Беларусі:**
1) працавалі на аснове прымусовага найму сялян;
2) належалі купцам і мяшчанам;
3) працавалі на аснове вольнага найму;
4) з'яўляліся вотчыннымі прадпрыемствамі.

**А16. Да рэвалюцыйна-дэмакратычнага лагера ў рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. належалі:**
1) бальшавікі; 3) кадэты;
2) бундаўцы; 4) эсэры.

**А17. Ініцыятарам стварэння Мінскай гарадской міліцыі стаў:**
1) А. Ізмайловіч; 3) І. Пуліхаў;
2) К. Ландар; 4) М. Фрунзе.

**А18. Мерапрыемствы, якія не адносяцца да палітыкі "ваеннага камунізму":**
1) увядзенне харчпадатку;
2) забарона свабоднага гандлю;
3) увядзенне ўсеагульнай працоўнай павіннасці;
4) розныя формы аплаты працы;
5) увядзенне савецкага чырвонца.

**А19. Восеньска-зімовае наступленне савецкіх войск пры вызваленні тэрыторыі Беларусі прынесла вызваленне абласным цэнтрам:**
1) Брэсту; 3) Мазыру;
2) Гомелю; 4) Мінску.

**А20. Лінія савецка-германскага фронту да лета 1944 г. называлася:**
1) "беларускі балкон"; 3) "Мажыно";
2) "Суражскія вароты"; 4) "Фатэрлянд".

**А21. Дзеянні 4-х франтоў пры вызваленні Беларусі каардынавалі:**
1) А. Васілеўскі; 3) Дз. Паўлаў;
2) Г. Жукаў; 4) С. Куцепаў.

**А22. Камандзір танкавага ўзвода, якому ўдалося захапіць мост цераз Свіслач, і савецкія танкі бесперашкодна прайшлі ў цэнтр Мінска пры вызваленні горада:**
1) А. Бурдзейны; 3) М. Колычаў;



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2) А. Данілаў; 4) В. Талаліхін.

**А23. На якой міжнароднай канферэнцыі, скліканай для заснавання ААН, было прынята рашэнне пра ўключэнне БССР і УССР у лік краін-заснавальніц?**

1) Берлінскай; 3) Парыжскай;
2) Маскоўскай; 4) Сан-Францыскай.

**А24. Кінарэжысёр шматсерыйнай тэлевізійнай стужкі "Руіны страляюць...":**

1) Б. Сцяпанаў; 3) Ю. Тарыч;
2) М. Пташук; 4) В. Тураў.

**А25. Кабінет міністраў Рэспублікі Беларусь са жніўня 1994 г. па лістапад 1996 г. узначальваў:**

1) В. Кебіч; 3) М. Чыгір;
2) К. Мазураў; 4) С. Шушкевіч.

**А26. Ці правільна, што з распадам СССР:**

а) прадпрыемствы страцілі крыніцу неабходнай для іх сыравіны і рынкі збыту сваёй прадукцыі; б) сабекошт прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў значна знізіўся?

1) правільна а); 3) абодва сцвярджэнні правільныя;
2) правільна б); 4) абодва сцвярждэнні няправільныя.

**А27. Першы Герой Рэспублікі Беларусь:**

1) І. Грыгаровіч; 3) П. Марыеў;
2) У. Корват; 4) П. Пракаповіч.

**А28. Выканаўчую ўладу ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляе:**

1) Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь; 3) Нацыянальны сход;
2) Вярхоўны суд; 4) Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**А29. Дзяржаўная мова ў Рэспубліцы Беларусь па выніках рэферэндуму 1995 г.:**

1) беларуская; 3) руская;
2) польская; 4) украінская.

**А30. Аўтар рамана "Меч князя Вячкі", прысвечанага перыяду існавання Полацкага княства:**

1) У. Арлоў; 3) Г. Далідовіч;
2) Л. Дайнека; 4) К. Тарасаў.

## Частка В

**В1. Вызначце ў паслядоўнасці час існавання на тэрыторыі Беларусі:**

1) перасяленне на землі прусаў рыцараў Тэўтонскага ордэна;
2) заснаванне Рыгі;
3) аб'яднанне Тэўтонскага і Лівонскага ордэнаў;
4) "вечны мір" паміж Полацкам і Ордэнам;
5) заснаванне ордэна мечаносцаў.

**В2. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**

1) устанаўленне адзіных ва ўсім ВКЛ відаў пакарання;
2) пачатак юрыдычнага афармлення прыгонніцтва ў ВКЛ;
3) змова М. Алелькавіча;
4) канчатковае ўключэнне ў склад ВКЛ Жамойціі;
5) пачатак феадальнай вайны ў ВКЛ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**В3. Вызначце ў храналагічнай паслядоўнасці:**
1) заснаванне "Таварыства ваенных сяброў";
2) заснаванне "Дэмакратычнага таварыства";
3) ліквідацыя уніяцкай царквы;
4) адмена дзеяння III Статута ВКЛ;
5) выступленне "ваенных сяброў" на чале з К. Ігельстромам;
6) стварэнне камітэта па справах заходніх губерняў.

**В4. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) Я. Брыль | 1) "Людзі на балоце" |
| Б) У. Караткевіч | 2) "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" |
| В) І. Мележ | 3) "Птушкі і гнёзды" |
| Г) І. Навуменка | 4) "Сорак трэці" |
| | 5) "Злая зорка" |

**В5. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) А. Кішчанка | 1) "Пасля Курлоўскага расстрэлу" |
| Б) А. Кроль | 2) "Партызанская мадонна" |
| В) М. Савіцкі | 3) "Легенда пра беларускіх партызан" |
| Г) М. Селяшчук | 4) "Вяртанне на радзіму" |

**В6. Суаднясіце паміж сабой:**
1) "Сказанне аб мніху Марціне";
2) "Се повести времяньных лет";
3) "Господи, помози рабу своему Борису";
4) "Рагвалодаў камень".

А) Ноўгарад;
Б) Орша;
В) Полацк;
Г) Тураў;
Д) Кіеў.

**В7. Суаднясіце паміж сабой:**
1) К. Лышчынскі;
2) С. Полацкі;
3) К. Семяновіч;
4) І. Капіевіч.

А) "Вялікае мастацтва артылерыі";
Б) "Буквар языка славенска";
В) "Аб неіснаванні Бога";
Г) "Стіхи краесогласныя";
Д) "Граматыка лацінская і руская".

**В8. Суаднясіце элементы двух мностваў:**

| | |
|---|---|
| А) Л. Брэжнеў | 1) "адліга" |
| Б) М. Гарбачоў | 2) "галоснасць" |
| В) М. Хручшоў | 3) "застой" |
| | 4) "перабудова" |

**В9. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
А) Другое абвяшчэнне ССРБ;
Б) Абвяшчэнне БНР;
В) Падпісанне Рыжскага мірнага дагавора;
Г) Узнікненне ў Мінску Камітэта выратавання рэвалюцыі
1) АБГВ
2) БВАГ
3) ВАГБ
4) ГБАВ.

**В10. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
А) Прыняцце Вярхоўным Саветам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;
Б) Прыняцце Закона "Аб мовах у БССР";

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

В) Падпісанне пагаднення аб калектыўнай бяспецы паміж краінамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў;
Г) Зацвярджэнне новай назвы нашай дзяржавы – Рэспубліка Беларусь і яе дзяржаўных сімвалаў.

1) АБВГ; 3) ВАГБ;
2) БГАВ; 4) ГБВА.

## Частка С

**Дайце азначэнне наступным паняццям:**

**С1.** Новы каляндарны год у старажытнасці ва ўсходніх славян пачынаўся са свята...
**С2.** Збор даніны князем з падуладнага насельніцтва называўся…
**С3.** Скульптурныя выявы язычніцкіх багоў, якіх ў Беларусі называлі "балванамі", "каменнымі бабамі", "кумірамі", "стодамі" і г.д. Гэта...
**С4.** Гаспадарка 1-й сялянскай сям'і, а таксама адзінка падаткаабкладання ў ВКЛ да ўвядзення валочнай памеры згодна з рэформай Жыгімонта II Аўгуста – гэта...
**С5.** Узгадайце аўтара наступных радкоў і адкажыце, аб якой бітве ідзе размова:
"Так, у панцырах, шлемах фанабэрлівыя тэўтоны
Падалі, стрэламі бітыя з тугіх калчаноў татарскіх.
Далей, нібы волаты, крочылі ў бой беларусы,
З імі – літоўцы з коп'ямі, настойлівыя і без страху..."
**С6.** Мастак, які ў 1995 г. выканаў габелен "Чарнобыль", што знаходзіцца ў будынку ААН у Нью-Йорку, а таксама "Габелен стагоддзя" – …
**С7.** Лепшы спартсмен свету 1991 – 2000 гг. Уладальнік шасці залатых медалёў, заваяваных за адну алімпіяду ў 1992 г., занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса – ...
**С8.** Дзяржава, знешнепалітычны курс якой характарызуецца няўдзелам ва ўзброенных канфліктах (войнах) – … .
**С9.** Дзяржаўны пераварот з удзелам невялікай групы загаворшчыкаў (тайная змова перавароту, акая не ажыццявілася) – … .
**С10.** Мастацкі метад, які патрабаваў адлюстравання ў літаратуры і мастацтве рэальнасцей жыцця, звязаных з савецкім сацыялістычным ладам, не такімі, якімі яны былі ў сапраўднасці, а такімі, якімі яны вызначаліся ў партыйных дакументах – … .

**Пісьмовае заданне**

*Чым характарызуецца развіццё адукацыі ў сярэдзіне 1950 – сярэдзіне 1980-х гг.?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Літаратура

### Асноўная


1. Каваленя А.А, Сташкевіч М.С. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): *11-ы кл.:* вучэб. дапам. – Мінск, 2004.
2. Галенчанка Г.Я. Гісторыя Беларусі XVI – XVIII ст.: *7-ы кл.:* вучэб. дапам. – Мінск., 1998.
3. Сташкевіч М.С. Гісторыя Беларусі: 1917–1996 гг.: *9-ы кл.:* вучэб. дапам. – Мінск, 1997.
4. Сташкевіч М.С. Гісторыя Беларусі: XIX–XX стст.: *11-ы кл.:* вучэб. дапам. – Мінск, 2001.
5. Сташкевіч М.С. Гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да канца XVIII ст.: *10-ы кл.:* вучэб. дапам. – Мінск, 2002.
6. Штыхаў Г.В. Гісторыя Беларусі старажытных часоў: *5-ы кл.:* вучэб. дапам. – Мінск, 2001.
7. Петрыкаў П.Ц. Гісторыя Беларусі ў сярэднія вякі: *6-ы кл.:* вучэб. дапам. – Мінск, 2002.
8. Бабосаў Я.М. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. – 1917 г.: *8-ы кл.:* вучэб. дапам. – Мінск, 1998.
9. Новік Я.К. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. – 1999 г.: *11-ы кл.:* вучэб. дапам. – Мінск, 2000.
10. Загарульскі Э.М. Гісторыя Беларусі з сярэдзіны I тысячагоддзя да Люблінскай уніі: *6-ы кл.:* вучэб. дапам. – Мінск, 1998.
11. Загарульскі Э.М. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны I тысячагоддзя н.э.: *5-ы кл.:* вучэб. дапам. – Мінск, 1998.
12. Крэнь І.П., Белазаровіч В.А. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да кан XVIII ст.: *10-ы кл.:* вучэб. дапам. для ўстаноў з 11-гадовым тэрмінам навучання. – Мінск, 2006.
13. Мілаванаў В.А. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. – 1917 г.: *8-ы кл.:* вучэб. дапам. – Мінск, 1998.
14. Петрыкаў П.Ц. Гісторыя Беларусі: 1917–2002 гг.: *9-ы кл.:* вучэб. дапам. – Мінск, 2002.
15. Петрыкаў П.Ц. Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. – XX ст.: *11-ы кл.:* вучэб. дапам. – Мінск, 2002.


### Дадатковая


1. Дуда М.Ю. Гісторыя Беларусі: увесь школьны курс у табліцах. – Мінск, 2007.
2. Лазіцкі В.Л. Гісторыя Беларусі: поўны курс падрыхтоўкі да тэсціравання і экзамену. У 3 ч. / пад агул. рэд. У.Н. Сідарцова. – Мінск, 2005.
3. Ходзіна Т.Ф, Шніп М.А. Гісторыя Беларусі: тыпавыя тэсты для падрыхтоўкі да ўступнага экзамену ў ВНУ. – Мінск, 2005.
4. Шарова Н.С. Гісторыя Беларусі: апорныя канспекты для падрыхтоўкі да цэнтраліз. тэсцір. – Мінск, 2009.
5. Штыхаў Г.В. Гісторыя Беларусі: дапам. для падрыхтоўкі да абавязковага цэнтраліз. тэсцір. – Мінск, 2006.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Змест

Тлумачальная запіска ........................................ 3
Метадычныя рэкамендацыі ........................................ 3
Кантрольная работа № 1 ........................................ 5
Кантрольная работа № 2 ........................................ 11
Кантрольная работа № 3 ........................................ 16
Кантрольная работа № 4 ........................................ 22
Кантрольная работа № 5 ........................................ 27
Кантрольная работа № 6 ........................................ 33
Кантрольная работа № 7 ........................................ 38
Кантрольная работа № 8 ........................................ 43
Кантрольная работа № 9 ........................................ 48
Літаратура ........................................ 54

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вучэбнае выданне

**Грышкевіч** Таццяна Віктараўна
**Янкоўская** Таццяна Уладзіміраўна

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

*Кантрольныя работы*

*для слухачоў*
*вочна-завочных падрыхтоўчых курсаў*

Адказны за выпуск *Л.М. Каранеўская*

Камп'ютэрная вёрстка *Т.В. Лыкавай*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Падпісана ў друк 21.08.09. Фармат 60x84 1/16. Папера афсетная.
Гарнітура Arial. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 3,26. Ул.-выд. 4,33.
Тыраж 150 экз. Заказ 338

Устнова адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка». Ліцэнзія № 02330/0494368 ад 16.03.09. 220050, Мінск, Савецкая, 18.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка ў Вучэбна-выдавецкім цэнтры БДПУ.
Ліцэнзія № 02330/0494171 ад 03.04.09. 220007, Мінск, Магілёўская, 37.